КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________ А.В.Макоўчык
“___” ___________2023 г.

Рэгістрацыйны № УД 31-2-48 / вуч.

# ФАНЕТЫКА – ЛЕКСІКА – СЛОВАЎТВАРЭННЕ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**
**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя**
**(Беларуская мова і літаратура);**
**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя**
**(Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы))**

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове прыкладнай вучэбнай праграмы «Фанетыка – Лексіка – Словаўтварэнне» (__.__.2023, № _________) і вучэбных планаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура; Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы))

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

Н.П.Лобань, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

В.В.Урбан, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

Н.А.Радзівануўская, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

Т.Я.Старасценка, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

М.Р.Прыгодзіч, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар;

У.І.Кулікові, загадчык кафедры рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар ДУА "Гімназія № 18 г. Мінска" _____________ Ю.В.Новік

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 11 ад 30.05.2023 г.)

Загадчык кафедры _____________ Д.В.Дзятко

Навукова-метадычным саветам ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 6 ад 21.06.2023 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела _____________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі _____________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма вучэбнай дысцыпліны “Фанетыка – Лексіка – Словаўтварэнне” прызначана для студэнтаў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура; Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)), з’яўляецца дысцыплінай модуля “Сучасная беларуская літаратурная мова” у якім раскрываюцца асноўныя заканамернасці сінхроннага развіцця сучаснай беларускай літаратурнай мовы і які выконвае асноўную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў-філолагаў. Гэтым вызначаюцца мэта і задачы курса.

**Асноўная мэта выкладання дысцыпліны** – развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне студэнтаў; сфарміраваць устаноўкі на практычнае прымяненне атрыманых студэнтамі ведаў у іх будучай прафесійнай дзейнасці; падрыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў для выкладання беларускай мовы ў навучальных установах рознага тыпу.

**Задачы вывучэння дысцыпліны**:

– даць грунтоўныя веды аб разнастайных моўных з’явах;

– выпрацаваць навуковыя погляды на фанетычную, фаналагічную, арфаэпічную, графічную, арфаграфічную, лексічную, фразеалагічную, словаўтваральную сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы, а таксама на беларускую лексікаграфію;

– удасканаліць навыкі беларускага вуснага і пісьмовага маўлення;

– выпрацаваць грунтоўныя ўменні і навыкі самастойнага лінгвістычнага аналізу моўных адзінак, з’яў і фактаў.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.*

Вучэбная дысцыпліна “Фанетыка – Лексіка – Словаўтварэнне” адносіцца да цыкла вучэбных дысцыплін дзяржаўнага кампанента, з’яўляецца складнікам модуля “Сучасная беларуская літаратурная мова”.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.*

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і сувязь яе з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі (“Беларускае мовазнаўства”, “Гісторыя беларускай літаратурнай мовы”, “Дыялекталогія беларускай мовы”), а таксама са школьным курсам беларускай мовы. Асаблівая ўвага пры выкладанні асобных тэм удзяляецца вывучэнню спецыфічных рыс сучаснай беларускай літаратурнай мовы, што з’яўляецца надзвычай важным ва ўмовах білінгвізму. Лекцыйныя і практычныя заняткі, прадугледжаныя вучэбным планам, узаемна звязаны і арганічна дапаўняюць адно аднаго, даючы магчымасць паглыбіць і ўдасканаліць набытыя веды. Пэўная колькасць тэм па вучэбнай дысцыпліне адведзена на самастойнае вывучэнне. Такая праца прывівае навыкі самастойнай вучобы, выхоўвае ў студэнтаў адказнасць, будзіць імкненне да самаразвіцця.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Фанетыка – Лексіка – Словаўтварэнне” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў **базавай прафесійнай кампетэнцыі** БПК-8: Аналізаваць моўныя факты з пункту гледжання іх зместу, формы і маўленчай інтэнцыі, улічваючы спецыфіку і заканамернасці функцыянавання адзінак розных моўных узроўняў (фанемнага, марфемнага, лексічнага).

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:**

– сістэму сучаснай беларускай мовы на фанетычным, фаналагічным, арфаэпічным, графічным, арфаграфічным, лексічным, фразеалагічным, словаўтваральным узроўнях;

– лінгвістычную тэрміналогію;

– навуковую і даведачную літаратуру па дадзеных раздзелах сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– літаратурныя нормы (фанетычныя, акцэнтуацыйныя, арфаэпічныя і арфаграфічныя, лексічныя, фразеалагічныя, словаўтваральныя) сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– прынцыпы і правілы беларускай арфаграфіі;

– асноўныя беларускія лексікаграфічныя выданні;

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **умець**:

– адбіраць, сістэматызаваць і правільна кваліфікаваць моўныя факты;

– праводзіць лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і высновы;

– выконваць фанетычны, графічны, арфаграфічны, лексічны, фразеалагічны, марфемны і словаўтваральны аналіз слоў;

– заўважаць і выпраўляць арфаэпічныя, акцэнтуацыйныя, арфаграфічныя, лексічныя, фразеалагічныя, словаўтваральныя памылкі;

– карыстацца слоўнікамі беалрускай мовы.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **валодаць**:

– фанетычнымі, акцэнтуацыйнымі, арфаэпічнымі, арфаграфічнымі, лексічнымі, фразеалагічнымі, словаўтваральнымі літаратурнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– асновамі культуры беларускага маўлення, якое ажыццяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах;

– навыкамі лінгвістычнага моўнага разбору на фанетычным, графічным, арфаграфічным, лексічным, фразеалагічным, марфемным і словаўтваральным узроўнях моўнай сістэмы;

– навыкамі маўленча-камунікатыўнай дзейнасці;

– правапісам сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– навыкамі пошуку інфармацыі ў лексікаграфічных выданнях.

***Структура зместу вучэбнай дысцыпліны.***

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу курса пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя раздзелы (тэмы).

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны ўключае ўводзіны і вучэбныя раздзелы (тэмы). Тэматычны змест вучэбнай дысцыпліны рэалізуецца ў наступных формах: лекцыйныя заняткі, практычныя заняткі, самастойная праца студэнтаў.

Вучэбная дысцыпліна на дзённым аддзяленні чытаецца на першым курсе ў 1 і 2 семестрах. У адпаведнасці з вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Фанетыка – Лексіка – Словаўтварэнне” на 1 курсе адводзіцца ўсяго 216 гадзні, аўдыторных – 124 гадзіны, у 1 семестры – усяго 108 вучэбных гадзін, з якіх 56 аўдыторныя (28 гадзін лекцыйных і 28 гадзін практычных заняткаў), а 52 гадзіны адводзяцца на самастойную працу студэнтаў, у

2 семестры – усяго 108 вучэбных гадзін, з якіх 68 – аўдыторныя (34 гадзіны лекцыйных і 34 гадзіны практычных заняткаў), а 40 гадзін адводзяцца на самастойную працу студэнтаў.

Форма атэстацыі: 1 семестр – ***экзамен***, 2 семестр – ***залік.***

*Размеркаванне гадзін у 1 семестры:*

| семестр | усяго гадзін | аўды-торныя | лекцыі | прак-тычныя | КСР | | самаст. работа | форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | лк | пр | | |
| 1 | 108 | 56 | 26 | 26 | 2 | 2 | 52 | экзамен |

*Размеркаванне гадзін у 2 семестры:*

| семестр | усяго гадзін | аўды-торныя | лекцыі | прак-тычныя | КСР | | самаст. работа | форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | лк | пр | | |
| 2 | 108 | 68 | 32 | 32 | 2 | 2 | 40 | залік |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## 1. УВОДЗІНЫ

1.1. Сучасная беларуская літаратурная мова як аб’ект вывучэння. Мэты і задачы курса “Сучасная беларуская літаратурная мова”, яго сувязь з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі. Раздзелы курса “Сучасная беларуская літаратурная мова”. Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа. Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры. Беларуская мова сярод славянскіх моў, яе адметнасць.

1.2. Беларуская нацыянальная мова. Літаратурная мова як форма нацыянальнай мовы, яе прыметы і асаблівасці.Нормы беларускай літаратурнай мовы (арфаэпічныя, арфаграфічныя, лексічныя, граматычныя, пунктуацыйныя, стылістычныя). Беларуская літаратурная мова і дыялекты беларускай мовы, іх узаемадзеянне.

1.3. Вядомыя беларускія мовазнаўцы, іх навуковая спадчына (І. І. Насовіч, Я. Ф. Карскі, Б. А. Тарашкевіч, М. В. Бірыла, Ф. М. Янкоўскі і інш.). Беларуская літаратурная мова на сучасным этапе. Закон аб мовах у Рэспубліцы Беларусь.

## 2. ФАНЕТЫКА

2.1. Прадмет і задачы фанетыкі. Асноўныя фанетычныя адзінкі (гук, склад, фанетычнае слова, маўленчы такт (сінтагма), фраза). Паняцце гука, аспекты яго характарыстыкі (акустычны (фізічны), артыкуляцыйны, функцыянальны).

2.2. Артыкуляцыйная характарыстыка гукаў. Галосныя і зычныя гукі.

2.3. Галосныя гукі і іх класіфікацыя (паводле ўдзелу губ, паводле ступені і месца пад’ёму языка).Зычныя гукі і іх класіфікацыя (паводле ўдзелу голасу і шуму, спосабу ўтварэння, месца ўтварэння, цвёрдасці і мяккасці). Няпарныя зычныя (паводле глухасці – звонкасці, цвёрдасці – мяккасці). Гукі [в], [ў] і іх месца ў сістэме зычных.

2.4. Змены гукаў у моўнай плыні. Пазіцыйныя змены зычных (асіміляцыя, дысіміляцыя, сцяжэнне гукаў, дзеканне і цеканне [д] – [z’], [т] – [ц’], аглушэнне зычных у канцы слова, узнікненне прыстаўных гукаў і інш.).

2.5. Пазіцыйныя змены галосных. Аканне (пасля цвёрдых і мяккіх фанем) у беларускай мове.

2.6. Чаргаванні гукаў. Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні галосных. Пазіцыйныя чаргаванні зычных (чаргаванні звонкіх і глухіх, цвёрдых і мяккіх, свісцячых і шыпячых). Гістарычныя чаргаванні зычных, іх тлумачэнне.

2.7. Склад як фанетычная адзінка. Артыкуляцыйная (экспіраторная) і акустычная (санорная) тэорыі склада. Тыпы складоў у беларускай мове. Складападзел.

2.8. Націск. Тыпы слоўнага націску: дынамічны (сілавы), колькасны (квантатыўны), музычны (танічны), змешаны. Месца націску ў слове (фіксаваны і свабодны, рухомы і нерухомы, асноўны і пабочны). Націск як сродак размежавання слоў і формаў слоў. Пазаслоўныя тыпы націску: тактавы, фразавы, лагічны націск.

2.9. Інтанацыя. Асаблівасці інтанацыі (мелодыка, інтэнсіўнасць, тэмбр, тэмп маўлення, паўзы). Функцыі інтанацыі (камунікацыйная, вылучальная, арганізуючая, эмацыянальная).

2.10. Фанетычная транскрыпцыя.
2.11. Фанетычны аналіз.

## 3. ФАНАЛОГІЯ

3.1. Фаналогія. Паняцце фанемы. Асноўныя функцыі фанем у мове: перцэптыўная і сігніфікатыўная. Дыферэнцыйныя (фаналагічна істотныя, сэнсаадрознівальныя) і інтэгральныя (тоесныя, агульныя) прыметы фанем. Моцная (незалежная) і слабая (залежная) пазіцыя фанемы.

3.2. Вырыянт і варыяцыя фанемы. Фанемны рад. Паняцце гіперфанемы і нейтралізацыі фанемы.

3.3. Сістэма галосных фанем у беларускай мове. Сістэма зычных фанем у беларускай мове.

## 4. АРФАЭПІЯ

4.1. Арфаэпія як раздзел мовазнаўства. Сувязь арфаэпіі з фанетыкай. Арфаэпічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

4.2. Вымаўленне націскных і ненаціскных галосных. Вымаўленне зычных і спалучэнняў зычных. Вымаўленне некаторых граматычных формаў.

4.3. Прычыны адхіленняў ад нормаў беларускага літаратурнага вымаўлення.Даведнікі па беларускай арфаэпіі.

## 5. ГРАФІКА

5.1. Графіка як раздзел мовазнаўства. Сувязь графікі з фанетыкай і арфаграфіяй. Літарныя і нялітарныя (націск, апостраф, злучок, пунктуацыйныя знакі і інш.) графічныя сродкі. Беларускі алфавіт. Суадносіны літар і гукаў. Абазначэнне мяккасці зычных. Перадача на пісьме гука [й]. Гукавы і складовы прынцыпы беларускай графікі. Адназначныя і двухзначныя літары. Ётавыя літары.

5.2. З гісторыі беларускай графікі. Тры графічныя сістэмы ў гісторыі беларускага пісьменства (кірылаўская, лацінская, арабская). Кірыліца – аснова беларускай графікі. Увядзенне грамадзянскага алфавіта (1708). Прыстасаванне кірыліцы для перадачы фанетычных рыс беларускай мовы (літары ў, і, ц, размежаванне літар е, ё, дыграфы дж, дз, апостраф і інш.). Выкарыстанне ў беларускім пісьменстве з канца XVII ст. лацінскай графічнай сістэмы (лацінкі). Паралельнае выкарыстанне ў кнігадрукаванні XIX – пачатку XX ст. кірыліцы і лацінкі. Тэксты, напісаныя арабскім пісьмом. Кітабы.

5.3. Графічны аналіз.

## 6. АРФАГРАФІЯ

6.1. Арфаграфія як раздзел мовазнаўства. Сувязь арфаграфіі з фанетыкай і графікай. Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі. Арфаграма і апорнае напісанне.

6.2. Напісанні, заснаваныя на фанетычным прынцыпе правапісу.Напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе правапісу.Традыцыйныя і дыферэнцыйныя напісанні ў беларускай мове.

6.3. З гісторыі беларускай арфаграфіі. Станаўленне сучаснай беларускай арфаграфічнай сістэмы. “Беларуская граматыка для школ” Б. Тарашкевіча (1918), яе роля ў замацаванні і ўсталяванні адзіных арфаграфічных і граматычных нормаў

беларускай літаратурнай мовы. Змены і спрашчэнні беларускага правапісу ў 1933 г. Удакладненні і частковыя змены беларускага правапісу ў 1957 г. “Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” (1959), іх значэнне ў далейшай нармалізацыі беларускага правапісу і пунктуацыі. “Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” (2008).

6.4. Асноўныя правілы беларускай арфаграфіі. Напісанні слоў разам, праз злучок і асобна. Правілы ўжывання вялікай літары. Напісанне абрэвіятур. Правілы скарачэння слоў.

6.5. Арфаграфічны аналіз. Арфаграфічныя слоўнікі і даведнікі.

## 7. ЛЕКСІКА

7.1. Паняцце аб лексіцы і лексікалогіі. Лексікалогія як раздзел мовазнаўства. Сувязь лексікалогіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства. Слова як адзінка лексічнай сістэмы. Асноўныя прыметы слова.

7.2. Лексічнае і граматычнае значэнні слова. Тыпы лексічных значэнняў слова: паводле сувязі з рэчаіснасцю (прамое і пераноснае); паводле ступені матываванасці: невытворнае (нематываванае, першаснае) і вытворнае (матываванае першым, зыходным значэннем).

Тыпы лексічных значэнняў слова паводле функцыі: намінатыўнае, эмацыянальна-ацэначнае, паводле лексічнай спалучальнасці: свабоднае і несвабоднае (фразеалагічна звязанае, сінтаксічна абумоўленае, канструктыўна абмежаванае).

Лексічна-семантычныя і прадметна-тэматычныя групы слоў.

7.3. Мнагазначнасць слова. Асноўныя тыпы пераносных значэнняў: метафара, метанімія, сінекдаха. Метафары прывычныя (акамянелыя, сцёртыя), агульнамоўныя (узуальныя), індывідуальна-аўтарскія (аказіянальныя). Шляхі развіцця мнагазначнасці. Асновы пераносу значэння.

7.4. Аманімія. Амонімы, іх тыпы. Адрозненне аманіміі ад мнагазначнасці. Лексічныя амонімы, іх тыпы (поўныя і няпоўныя). Шляхі ўзнікнення лексічных амонімаў. Марфалагічныя, фанетычныя, графічныя амонімы (амаформы, амафоны, амографы). Лексічныя і лексічна-граматычныя амонімы (поўныя і няпоўныя). Марфалагічныя амонімы (амаформы). Фанетычныя і графічныя амонімы (амафоны, амографы). Міжмоўныя амонімы.

7.5. Паранімія. Паронімы, крытэрыі іх вызначэння. Адрозненне паронімаў ад амонімаў і сінонімаў. Стылістычнае выкарыстанне амонімаў і паронімаў. Слоўнікі амонімаў і паронімаў.

7.6. Сінанімія. Сінонімы, іх тыпы (семантычныя, стылістычныя і семантычна-стылістычныя). Сувязь сінаніміі з мнагазначнасцю. Сінанімічны рад. Шляхі ўзнікнення лексічных сінонімаў. Абсалютныя сінонімы (лексічныя дублеты). Кантэкстуальныя сінонімы. Стылістычная роля сінонімаў. Слоўнікі сінонімаў.

7.7. Антанімія. Антонімы, іх разнавіднасці. Антанімія і мнагазначнасць. Рознакаранёвыя і аднакаранёвыя антонімы. Кантэкстуальныя антонімы. Стылістычнае выкарыстанне антонімаў (антытэза і аксюмаран). Слоўнікі антонімаў.

7.8. Лексіка сучаснай беларускай мовы паводле паходжання. Спрадвечна беларуская лексіка. Гістарычныя пласты спрадвечна беларускай лексікі: індаеўрапейскія, агульнаславянскія, усходнеславянскія і ўласнабеларускія словы. Запазычаныя словы ў беларускай мове. Запазычанні са славянскіх (рускай, украінскай, польскай і інш.) і неславянскіх моў (грэчаскай, лацінскай, французскай, нямецкай, англійскай, італьянскай і інш.), іх прыметы. Фанетычнае, марфалагічнае,

семантычнае асваенне запазычаных слоў. Калькі і паўкалькі. Інтэрнацыянальная лексіка. Экзатызмы. Варварызмы.

Этымалагічныя слоўнікі. Слоўнікі запазычаных слоў.

7.9. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання. Дыялектная лексіка. Дыялектызмы, іх тыпы (лексічныя, семантычныя, фанетычныя, граматычныя, словаўтваральныя). Спецыяльная лексіка (тэрміналагічная і прафесійная). Узаемасувязь агульнаўжывальнай і тэрміналагічнай лексікі (тэрміналагізацыя і дэтэрміналагізацыя). Жаргонная лексіка і аргатызмы. Стылістычнае выкарыстанне лексікі абмежаванага ўжывання.

7.10. Актыўная і пасіўная лексіка. Устарэлыя словы (гістарызмы і архаізмы). Гістарызмы часу і стылістычнага выкарыстання. Тыпы архаізмаў (уласналексічныя, лексічна-словаўтваральныя, лексічна-фанетычныя, лексічна-семантычныя). Стылістычнае выкарыстанне ўстарэлых слоў. Гістарычныя слоўнікі.

Неалагізмы, шляхі іх узнікнення. Разнавіднасці неалагізмаў (лексічныя і семантычныя). Індывідуальна-аўтарскія неалагізмы (аказіяналізмы).

Развіццё лексікі беларускай мовы. Крыніцы і шляхі ўзбагачэння літаратурнай лексікі.

7.11. Стылістычная дыферэнцыяцыя лексікі беларускай літаратурнай мовы. Лексіка стылістычна нейтральная (міжстылёвая). Стылістычна афарбаваная лексіка: кніжная (навуковая, афіцыйна-дзелавая, публіцыстычная, паэтычная лексіка) і гутарковая (размоўная).

Лексічны аналіз.

## 8. ФРАЗЕАЛОГІЯ

8.1. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Фразеалагізм як адзінка мовы, яго асноўныя асаблівасці (семантычная цэласнасць, устойлівасць, узнаўляльнасць, кампанентны склад, сінтаксічная непадзельнасць, эмацыянальна-экспрэсіўная афарбоўка і інш.). Фразеалагізм і слова. Фразеалагізм і словазлучэнне. Варыянтнасць фразеалагічных адзінак. Мнагазначнасць, аманімічнасць, сінанімічнасць і антанімічнасць фразеалагізмаў.

8.2. Тыпы фразеалагізмаў паводле семантычнай злітнасці кампанентаў (зрашчэнні, адзінствы, спалучэнні); паводле суадноснасці з часцінамі мовы (назоўнікавыя, прыметнікавыя, дзеяслоўныя, прыслоўныя і інш.); паводле адпаведнасці сінтаксічным адзінкам (адпаведныя словазлучэнню, сказу, спалучэнню). Спалучальнасць фразеалагізмаў. Сінтаксічная функцыя фразеалагізмаў.

8.3. Функцыянальна-стылявыя разрады фразеалагізмаў (міжстылёвыя, кніжныя, гутарковыя).

8.4. Фразеалогія беларускай мовы паводле паходжання. Спрадвечна беларускія і запазычаныя фразеалагізмы. Гістарычныя пласты спрадвечна беларускай фразеалогіі: агульнаславянскія, усходнеславянскія і ўласнабеларускія фразеалагізмы. Фразеалагічныя калькі. Крыніцы беларускай фразеалогіі.

Індывідуальна-аўтарскае ўжыванне фразеалагізмаў у мове мастацкіх твораў (прыёмы аўтарскага абнаўлення фразеалагізмаў). Фразеалагізмы і іх пераклад.

Фразеалагічныя слоўнікі.

Фразеалагічны аналіз.

8.5. Парэміялогія як раздзел мвазнаўства. Прыказкі і прымаўкі. Устойлівыя параўнанні. Крылатыя словы, выслоўі і афарызмы. Перыфраза. Перыфразы традыцыйныя і індывідуальна-аўтарскія.

Парэміяграфічныя зборнікі (прыказак і прымавак). Зборнікі ўстойлівых параўнанняў, крылатых слоў і афарызмаў, перыфраз.

## 9. ЛЕКСІКАГРАФІЯ

9.1. Лексікаграфія як раздзел мовазнаўства. Энцыклапедычныя і лінгвістычныя слоўнікі (даведнікі). Тыпы лінгвістычных слоўнікаў: аднамоўныя, двухмоўныя і шматмоўныя; тлумачальныя, перакладныя, гістарычныя, этымалагічныя, дыялектныя, фразеалагічныя, тэрміналагічныя, арфаэпічныя, арфаграфічныя, марфемныя, словаўтваральныя, граматычныя, іншамоўных слоў, слоўнікі сінонімаў, амонімаў, антонімаў, паронімаў, слоўнікі эпітэтаў; частотныя, адваротныя, асацыятыўныя, слоўнікі мовы пісьменнікаў; анамастычныя слоўнікі і інш.

9.2. Будова слоўнікавага артыкула ў энцыклапедычных і лінгвістычных слоўніках. Сістэма граматычных і стылістычных памет, тыпы дэфініцый у тлумачальных слоўніках.

Беларускія энцыклапедычныя выданні (універсальныя, галіновыя і персанальныя). Беларускія слоўнікі для школ (тлумачальныя, перакладныя, арфаграфічныя, марфемныя, словаўтваральныя, фразеалагічныя і інш.).

9.3. З гісторыі беларускай лексікаграфіі. Лексікаграфічная праца Ф. Скарыны, Л. Зізанія, П. Бярынды, І. Насовіча, Я. Ціхінскага і інш. “Словарь белорусского наречия” І. Насовіча (1870). Лексікаграфічная праца ў 20 – 30-я гады XX ст. (тэрміналагічныя, перакладныя, дыялектныя слоўнікі).

## 10. МАРФЕМІКА

10.1. Марфеміка як вучэнне аб мінімальных значымых частках слова – марфемах. Паняцце марфемы, морфа, аламорфа. Марфемная структура слова.

10.2. Класіфікацыя марфем. Каранёвыя і афіксальныя (службовыя) марфемы. Афіксальныя марфемы, іх тыпы (словаўтваральныя і формаўтваральныя, рэгулярныя і нерэгулярныя, прадуктыўныя і непрадуктыўныя). Варыянтнасць, сінанімія, полісемія, аманімія, антанімія марфем.

Аснова слова і яе тыпы (невытворная і вытворная; аснова словазмянення, формаўтварэння і словаўтварэння; перарывістая і неперарывістая аснова; суплетыўныя асновы). Канчатак (флексія), яго роля ў слове. Нулявы канчатак. Корань слова. Варыянты (мадыфікацыі, або фанетычныя разнавіднасці) кораня. Свабодныя і звязаныя карані. Афіксы (прэфікс, суфікс, постфікс, інтэрфікс, конфікс). Прыстаўка (прэфікс) і суфікс. Нулявы суфікс. Варыянты прыставак і суфіксаў. Словаўтваральныя і формаўтваральныя прыстаўкі і суфіксы.

Сінкрэтычныя марфемы. Афіксоіды (прэфіксоіды, суфіксоіды) як марфемы пераходнага тыпу. Постфікс. Словаўтваральныя і формаўтваральныя постфіксы. Конфікс. Пытанне аб інтэрфіксах, постфіксах, конфіксах у лінгвістычнай літаратуры.

Марфемны аналіз слова.

10.3. Змены ў марфемнай структуры слова: апрошчанне, перараскладанне, ускладненне, дэкарэляцыя. Прычыны змен у марфемнай будове слова. Дээтымалагізацыя.

## 11. СЛОВАЎТВАРЭННЕ

11.1. Словаўтварэнне як навука. Асноўныя паняцці і адзінкі словаўтварэння. Утваральная аснова (база) і словаўтваральныя сродкі (фарманты). Класіфікацыйныя адзінкі словаўтварэння: словаўтваральная пара, словаўтваральны ланцужок, словаўтваральная парадыгма, словаўтваральны рад, словаўтваральнае гняздо. Паняцце словаўтваральнага тыпу, словаўтваральнай мадэлі.

11.2. Спосабы словаўтварэння. Марфалагічнае (марфемнае) словаўтварэнне (афіксацыя). Разнавіднасці марфалагічнага словаўтварэння: суфіксальнае, прыставачнае (прэфіксальнае), прыставачна-суфіксальнае, постфіксальнае, прыставачна-постфіксальнае, прыставачна-суфіксальна-постфіксальнае, нульсуфіксальнае. Прадуктыўныя, малапрадуктыўныя і непрадуктыўныя прыстаўкі і суфіксы. Складанне і яго разнавіднасці: асноваскладанне, словаскладанне, складана-суфіксальнае словаўтварэнне, абрэвіяцыя і яе разнавіднасці.

Марфалагічна-сінтаксічнае словаўтварэнне (субстантывацыя, ад’ектывацыя, праназміналізацыя, адвербіялізацыя).

Лексіка-семантычнае словаўтварэнне. Словаўтваральнае калькаванне як адзін са спосабаў лексічнай дэрывацыі. Прадуктыўныя і непрадуктыўныя спосабы словаўтварэння.

Марфемныя і словаўтваральныя слоўнікі.

Словаўтваральны і этымалагічны аналізы слова.

# Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны
## (дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)
### 1 семестр

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | | Самастойная праца | Метадычнае забеспячэнне заняткаў | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя | Лекцыйныя заняткі | Практычныя заняткі | | | | |
| **1.** | **Уводзіны** | **2** | **2** | **2** | | **8** | | | |
| 1.1. | 1. Сучасная беларуская літаратурная мова як аб’ект вывучэння. Мэты і задачы курса “Сучасная беларуская літаратурная мова”, яго сувязь з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі. Раздзелы курса “Сучасная беларуская літаратурная мова”.<br>2. Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа.<br>3. Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры.<br>4. Беларуская мова сярод славянскіх моў, яе адметнасць. | 2 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| 1.2. | 1. Беларуская нацыянальная мова. Літаратурная мова як форма нацыянальнай мовы, яе прыметы і асаблівасці.<br>2. Нормы беларускай літаратурнай мовы (арфаэпічныя, арфаграфічныя, лексічныя, граматычныя, пунктуацыйныя, стылістычныя).<br>3. Беларуская літаратурная мова і дыялекты беларускай мовы, іх узаемадзеянне. | | 2 | | | 2 | Наглядныя матэрыялы па тэме заняткаў. | 1, 2, 2д, 3д | Індывідуальнае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў |
| 1.3. | 1. Вядомыя беларускія мовазнаўцы, іх навуковая спадчына (І. І. Насовіч, Я. Ф. Карскі, Б. А. Тарашкевіч, М. В. Бірыла, Ф. М. Янкоўскі і інш.).<br>2. Беларуская літаратурная мова на сучасным этапе.<br>3. Закон аб мовах у Рэспубліцы Беларусь. | | | 2 | | 4 | Прэзентацыі па тэме заняткаў. | 1, 2, 2д, 3д | Праверка самастойна падрыхтавана-га канспекта лекцыі, даклада і прэзентацыі. |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2.** | **Фанетыка** | **12** | **10** | | | **20** | | | |
| 2.1. | 1. Прадмет і задачы фанетыкі.<br>2. Асноўныя фанетычныя адзінкі (гук, склад, фанетычнае слова, маўленчы такт (сінтагма), фраза).<br>3. Паняцце гука, аспекты яго характарыстыкі (акустычны (фізічны), артыкуляцыйны, функцыянальны). | 2 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 3д | |
| 2.2. | 1. Артыкуляцыйная характарыстыка гукаў.<br>2. Галосныя і зычныя гукі. | 2 | | | | 2 | Схема па тэме заняткаў | 1, 2, 3д | |
| 2.3. | 1. Галосныя гукі і іх класіфікацыя (паводле ўдзелу губ, паводле ступені і месца пад'ёму языка).<br>2. Зычныя гукі і іх класіфікацыя (паводле ўдзелу голасу і шуму, спосабу ўтварэння, месца ўтварэння, цвёрдасці і мяккасці.<br>3. Няпарныя зычныя (паводле глухасці – звонкасці, цвёрдасці – мяккасці).<br>4. Гукі [в], [ў] і іх месца ў сістэме зычных. | | 2 | | | 2 | Схема па тэме заняткаў | 1, 2, 2д, 3д | Індывідуальнае апытванне. Праверка выкананых практыка-ванняў. |
| 2.4. | 1. Змены гукаў у моўнай плыні.<br>2. Пазіцыйныя змены зычных (асіміляцыя, дысіміляцыя, сцяжэнне гукаў, дзеканне і цеканне [д] – [z'], [т] – [ц'], аглушэнне зычных у канцы слова, узнікненне прыстаўных гукаў і інш.). | 2 | | | | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 3д | |
| 2.5. | 1. Пазіцыйныя змены галосных.<br>2. Аканне (пасля цвёрдых і мяккіх фанем) у беларускай мове. | | 2 | | | | Наглядныя матэрыялы па тэме заняткаў. | 1, 2, 2д, 3д | Праверка выкананых практыка-ванняў. |
| 2.6. | 1. Чаргаванні гукаў.<br>2. Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні галосных.<br>3. Пазіцыйныя чаргаванні зычных (чаргаванні звонкіх і глухіх, цвёрдых і мяккіх, свісцячых і шыпячых).<br>4. Гістарычныя чаргаванні зычных, іх тлумачэнне. | 2 | | | | 2<br>2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 3д | |
| 2.7. | 1. Склад як фанетычная адзінка.<br>2. Артыкуляцыйная (экспіраторная) і акустычная (санорная) тэорыі склада.<br>3. Тыпы складоў у беларускай мове.<br>4. Складападзел. | 2 | | | | 2<br>2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 3д | |
| 2.8. | 1. Націск.<br>2. Тыпы слоўнага націску: дынамічны (сілавы), колькасны (квантатыўны), музычны (танічны), змешаны.<br>3. Месца націску ў слове (фіксаваны і свабодны, рухомы і | 2 | | | | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 3д | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | нерухомы, асноўны і пабочны).<br>4. Націск як сродак размежавання слоў і формаў слоў.<br>5. Пазаслоўныя тыпы націску. | | | | | 2 | | | |
| 2.9. | 1.Інтанацыя.<br>2. Асаблівасці інтанацыі (мелодыка, інтэнсіўнасць, тэмбр, тэмп маўлення, паўзы).<br>3. Функцыі інтанацыі (камунікацыйная, вылучальная, арганіз эмацыянальная). | | 2 | | | | Наглядныя матэрыялы па тэме заняткаў. | 1, 2, 2д, 3д | Франтальнае апытванне. |
| 2.10 | 1. Фанетычная транскрыпцыя.<br>2. Фанетычная транскрыпцыя тэкстаў розных стыляў. | | 2 | | | 2 | Наглядныя матэрыялы па тэме заняткаў. | 1, 2, 3д, 2д, 3д | Праверка фанетычнай транскрыпцыі і аналіз яе выканання. |
| 2.11 | 1. Фанетычны аналіз як від моўнага аналізу.<br>2. Фанетычны аналіз.<br>3. Актуалізацыя і кантроль апорных ведаў, уменняў і навыкаў па тэме “Фанетыка”. | | 2 | | | 2 | Схема па тэме заняткаў. | 1, 2, 2д, 3д | |
| **3.** | **Фаналогія** | **2** | **4** | | | **4** | | | |
| 3.1. | 1. Паняцце фанемы.<br>2. Асноўныя функцыі фанем у мове.<br>3. Дыферэнцыйныя (фаналагічна істотныя, сэнсаадрознівальныя) і інтэгральныя (тоесныя, агульныя) прыметы фанем.<br>4. Моцная (незалежная) і слабая (залежная) пазіцыя фанемы. | 2 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| 3.2. | 1. Варыянт і варыяцыя фанемы.<br>2. Фанемны рад. | | 2 | | | | Схема па тэме заняткаў | 1, 2, 2д, 3д | Франтальнае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў |
| 3.3. | 1. Сістэма зычных фанем у беларускай мове.<br>2. Сістэма галосных фанем у беларускай мове. | | 2 | | | 2 | Наглядныя матэрыялы па тэме заняткаў. | 1, 2, 2д, 3д | Праверка пісьмовай работы. |
| **4.** | **Арфаэпія** | **2** | **2** | | | **8** | | | |
| 4.1. | 1. Арфаэпія як раздзел моваведства.<br>2. Арфаэпічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. | 2 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4.2. | 1. Вымаўленне націскных і ненаціскных галосных<br>2. Вымаўленне зычных і спалучэнняў зычных.<br>3. Вымаўленне некаторых граматычных формаў.<br>4. Фанетычная транскрыпцыя. | | 2 | | | 2 | Наглядныя матэрыялы па тэме заняткаў. | 1, 2, 2д, 3д | Праверка выкананых практыка-ванняў. |
| 4.3 | 1. Прычыны адхіленняў ад нормаў беларускага літаратурнага вымаўлення. 2. Даведнікі па беларускай арфаэпіі. | | | | | 4 | | | |
| **5.** | **Графіка** | **4** | **2** | | | **4** | | | |
| 5.1. | 1. Графіка як раздзел мовазнаўства.<br>2. Сувязь графікі з фанетыкай і арфаграфіяй.<br>3. Літарныя і нялітарныя (націск, апостраф, злучок, пунктуацыйныя знакі і інш.) графічныя сродкі.<br>4. Беларускі алфавіт. Суадносіны літар і гукаў.<br>5. Абазначэнне мяккасці зычных. Перадача на пісьме гука [й].<br>6. Гукавы і складовы прынцыпы беларускай графікі.<br>7. Адназначныя і двухзначныя літары. Ётавыя літары. | 2 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| 5.2. | 1. З гісторыі беларускай графікі. Тры графічныя сістэмы ў гісторыі беларускага пісьменства (кірылаўская, лацінская, арабская).<br>2. Кірыліца – аснова беларускай графікі. Увядзенне грамадзянскага алфавіта (1708). Прыстасаванне кірыліцы для перадачы фанетычных рыс беларускай мовы (літары ў, і, ц, размежаванне літар е, ё, дыграфы дж, дз, апостраф і інш.).<br>3. Выкарыстанне ў беларускім пісьменстве з канца XVII ст. лацінскай графічнай сістэмы (лацінкі). Паралельнае выкарыстанне ў кнігадрукаванні XIX – пачатку XX ст. кірыліцы і лацінкі.<br>4. Тэксты, напісаныя арабскім пісьмом. Кітабы. | 2 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| 5.3. | 1. Графічны аналіз. | | 2 | | | | Схема графічнага аналізу. | 1, 2, 2д, 3д | Рэйтынгавая кантрольная работа № 1 |
| **6.** | **Арфаграфія** | **4** | **6** | | **2** | **8** | | | |
| 6.1. | 1. Арфаграфія як раздзел мовазнаўства.<br>2. Сувязь арфаграфіі з фанетыкай і графікай.<br>3. Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі.<br>4. Арфаграма і апорнае напісанне. | 2 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 1д, 2д, 3д | |
| 6.2. | 1. Напісанні, заснаваныя на фанетычным прынцыпе правапісу.<br>2. Напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе правапісу.<br>3. Традыцыйныя і дыферэнцыйныя напісанні ў беларускай мове. | | 2 | | | | Наглядныя матэрыялы па тэме заняткаў. | 1, 2, 1д, 3д | Індывідуальнае апытванне. |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6.3. | 1. З гісторыі беларускай арфаграфіі.<br>2. Станаўленне сучаснай беларускай арфаграфічнай сістэмы.<br>3. “Беларуская граматыка для школ” Б. Тарашкевіча (1918).<br>4. Змены і спрашчэнні беларускага правапісу ў 1933 г.<br>5. Удакладненні і частковыя змены беларускага правапісу ў 1957 г.<br>6. “Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” (1959), іх значэнне ў далейшай нармалізацыі беларускага правапісу і пунктуацыі.<br>7. “Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” (2008). | 2 | | | | 4 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 1д, 2д, 3д | |
| 6.4. | 1. Асноўныя правілы беларускай арфаграфіі.<br>2. Напісанні слоў разам, праз злучок і асобна.<br>3. Правілы ўжывання вялікай літары. Напісанне абрэвіятур. Правілы скарачэння слоў.<br>4. Вызначэнне прынцыпаў арфаграфіі; адрозненне напісанняў, заснаваных на розных прынцыпах. | | 2 | | 2 | | Дапаможнік “Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” (2008). | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Праверка выканання заданняў. |
| 6.5. | 1. Арфаграфічны аналіз.<br>2. Арфаграфічныя слоўнікі і даведнікі.<br>3. Актуалізацыя і кантроль апорных ведаў, уменняў і навыкаў па тэмах“Графіка” і “Арфаграфія”. | | 2 | | | 2 | Схема арфаграфічнага аналізу. | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 |
| | ***Усяго гадзін у 1 семестры: 108 г.*** | ***26*** | ***26*** | ***2*** | ***2*** | ***52*** | | | ***Экзамен*** |

**2 семестр**

| Назва раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | | Самастойная праца | Метадычнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя | Лекцыйныя заняткі | Практычныя заняткі | | | | |
| **7.** | **Лексіка** | **18** | **14** | | **2** | **16** | | | |
| 7.1. | 1. Паняцце аб лексіцы і лексікалогіі.<br>2. Лексікалогія як раздзел мовазнаўства.<br>3. Сувязь лексікалогіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства.<br>4. Слова як адзінка лексічнай сістэмы.<br>5. Асноўныя прыметы слова. | 1 | | | | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| 7.2. | 1. Лексічнае і граматычнае значэнні слова.<br>2. Тыпы лексічных значэнняў слова: паводле сувязі з рэчаіснасцю (прамое і пераноснае); паводле ступені матываванасці: невытворнае (нематываванае, першаснае) і вытворнае (матываванае першым, зыходным значэннем). | 1 | | | | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| | 1. Тыпы лексічных значэнняў слова паводле функцыі: намінатыўнае, эмацыянальна-ацэначнае, паводле лексічнай спалучальнасці: свабоднае і несвабоднае (фразеалагічна звязанае, сінтаксічна абумоўленае, канструктыўна абмежаванае).<br>2. Лексічна-семантычныя і прадметна-тэматычныя групы слоў. | | 1 | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | Выбарачнае апытванне. |
| 7.3. | 1. Мнагазначнасць слова.<br>2. Асноўныя тыпы пераносных значэнняў: метафара, метанімія, сінекдаха.<br>3. Метафары прывычныя (акамянелыя, сцёртыя), агульнамоўныя (узуальныя), індывідуальна-аўтарскія (аказіянальныя). | 2 | | | | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| | 1. Шляхі развіцця мнагазначнасці.<br>2. Асновы пераносу значэння. | | 1 | | | | | | Індывідуальнае апытванне. |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 7.4. | 1. Аманімія. Амонімы, іх тыпы.<br>2. Адрозненне аманіміі ад мнагазначнасці.<br>3. Лексічныя амонімы, іх тыпы (поўныя і няпоўныя).<br>4. Шляхі ўзнікнення лексічных амонімаў. | 1 | | | | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| | 1. Лексічныя і лексічна-граматычныя амонімы.<br>2. Марфалагічныя амонімы (амаформы).<br>3. Фанетычныя і графічныя амонімы (амафоны, амографы).<br>4. Міжмоўныя амонімы. | | 2 | | | | Наглядныя матэрыялы па тэме заняткаў. | 1, 2, 2д, 3д | Праверка выкананых практыкаванняў |
| 7.5. | 1. Паранімія. Паронімы, крытэрыі іх вызначэння.<br>2. Адрозненне паронімаў ад амонімаў і сінонімаў.<br>3. Стылістычнае выкарыстанне амонімаў і паронімаў.<br>4. Слоўнікі амонімаў і паронімаў. | 1 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| 7.6. | 1. Сінанімія.<br>2. Сінонімы, іх тыпы (семантычныя, стылістычныя і семантычна-стылістычныя).<br>3. Сувязь сінаніміі з мнагазначнасцю. | 2 | | | | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| | 1. Абсалютныя сінонімы (лексічныя дублеты).<br>2. Кантэкстуальныя сінонімы.<br>3. Стылістычная роля сінонімаў. Слоўнікі сінонімаў.<br>4. Сінанімічны рад.<br>5. Шляхі ўзнікнення сінонімаў. | | 2 | | | | Наглядныя матэрыялы па тэме заняткаў. | 1, 2, 2д, 3д | Праверка выкананых практыкаванняў Франтальнае апытванне. |
| 7.7. | 1. Антанімія.<br>2. Антонімы, іх разнавіднасці.<br>3. Антанімія і мнагазначнасць.<br>4. Рознакаранёвыя і аднакаранёвыя антонімы.<br>5. Кантэкстуальныя антонімы.<br>6. Стылістычнае выкарыстанне антонімаў (антытэза і аксюмаран).<br>7. Слоўнікі антонімаў.<br>8. Стылістычнае выкарыстанне сінонімаў, амонімаў, паронімаў, антонімаў. | 2 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы па тэме заняткаў. | 1, 2, 2д, 3д 1, 2, 2д, 3д | Франтальнае апытванне. Тэрміналагічны дыктант. |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 7.8. | 1. Лексіка сучаснай беларускай мовы паводле паходжання.<br>2. Спрадвечна беларуская лексіка.<br>3. Гістарычныя пласты спрадвечна беларускай лексікі: індаеўрапейскія словы, агульнаславянскія, усходнеславянскія і ўласнабеларускія словы.<br>4. Запазычаныя словы ў беларускай мове.<br>5. Калькі і паўкалькі.<br>6. Інтэрнацыянальная лексіка. Экзатызмы. Варварызмы. | 2 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| | 1. Запазычанні з неславянскіх моў, іх прыметы.<br>2. Запазычанні са славянскіх (рускай, украінскай, польскай і інш.) моў і іх прыметы.<br>3. Фанетычнае, марфалагічнае, семантычнае асваенне запазычаных слоў.<br>4. Этымалагічныя слоўнікі. Слоўнікі запазычаных слоў. | 2 | 2 | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | Праверка выканання практычных заданняў. |
| 7.9. | 1. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання.<br>2. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання.<br>3. Спецыяльная лексіка (тэрміналагічная і прафесійная).<br>4. Жаргонная лексіка. Аргатызмы.<br>5. Дыялектная лексіка.<br>6. Дыялектызмы, іх тыпы (лексічныя, семантычныя, фанетычныя, граматычныя, словаўтваральныя). | 2 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| | 1. Узаемасувязь агульнаўжывальнай і тэрміналагічнай лексікі (тэрміналагізацыя і дэтэрміналагізацыя).<br>2. Стылістычнае выкарыстанне лексікі абмежаванага ўжывання. | | 2 | | | | | 1, 2, 2д, 3д | Франтальнае апытванне. |
| 7.10 | 1. Актыўная і пасіўная лексіка.<br>2. Устарэлыя словы (гістарызмы і архаізмы). Гістарызмы часу стылістычнага выкарыстання.<br>3. Тыпы архаізмаў.<br>4. Неалагізмы, шляхі іх узнікнення.<br>5. Разнавіднасці неалагізмаў (лексічныя і семантычныя).<br>6. Індывідуальна-аўтарскія неалагізмы (аказіяналізмы). | 2 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| | 1.Гістарызмы і архаізмы, іх тыпы.<br>2.Неалагізмы, іх разнавіднасці і стылістычнае выкарыстанне. | | 2 | | | 2 | | 1, 2, 2д, 3д | Праверка выкананых практыкаванняў |
| | 1. Стылістычнае выкарыстанне ўстарэлых слоў. Гістарычныя слоўнікі. | | | | 2 | | | 1, 2, 2д, | Праверка выкананых |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Развіццё лексікі беларускай мовы. Крыніцы і шляхі ўзбагачэння літаратурнай лексікі. | | | | | | | 3д | заданняў па КСР. |
| 7.11 | 1. Стылістычная дыферэнцыяцыя лексікі беларускай мовы.<br>2. Лексіка стылістычна нейтральная (міжстылёвая) і стылістычна афарбаваная лексіка.<br>3. Лексічны аналіз.<br>4. Актуалізацыя і кантроль апорных ведаў, уменняў і навыкаў па тэмах “Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання”, “Стылістычная дыферэнцыяцыя лексікі беларускай літаратурнай мовы”, “Актыўная і пасіўная лексіка”. | | 2 | | | | Схема лексічнага аналізу. | 1, 2, 2д, 3д | Кантрольная работа. |
| **8.** | **Фразеалогія** | **4** | **6** | | | **8** | | | |
| 8.1. | 1. Фразеалогія як раздзел моваазнаўства.<br>2. Фразеалагізм як адзінка мовы, яго асноўныя асаблівасці. 3. Фразеалагізм і слова. Фразеалагізм і словазлучэнне.<br>4. Варыянтнасць фразеалагічных адзінак.<br>5. Мнагазначнасць, аманімічнасць, сінанімічнасць і антанімічнасць фразеалагізмаў. | 2 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| 8.2. | 1. Тыпы фразеалагізмаў паводле семантычнай злітнасці кампанентаў (зрашчэнні, адзінствы, спалучэнні).<br>2. Тыпы фразеалагізмаў паводле суадносінасці з часцінамі мовы (назоўнікавыя, прыметнікавыя, дзеяслоўныя, прыслоўныя).<br>3. Тыпы фразеалагізмаў паводле адпаведнасці сінтаксічным адзінкам (адпаведныя словазлучэнню, сказу, спалучэнню).<br>4. Спалучальнасць фразеалагізмаў.<br>5. Сінтаксічная функцыя фразеалагізмаў. | 2 | | | | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| | 1. Тыпы фразеалагізмаў паводле семантычнай злітнасці кампанентаў; паводле суадносінасці з часцінамі мовы; паводле адпаведнасці сінтаксічным адзінкам. | | 2 | | | 2 | Наглядныя матэрыялы па тэме заняткаў. | 1, 2, 2д, 3д | Ушчыльненае апытванне. |
| 8.3. | 1. Функцыянальна-стылявыя разрады фразеалагізмаў (міжстылёвыя, кніжныя, гутарковыя).<br>2. Індывідуальна-аўтарскае ўжыванне фразеалагізмаў у мове мастацкіх твораў.<br>3. Фразеалагізмы і іх пераклад. | | 1 | | | | Наглядныя матэрыялы па тэме заняткаў. | 1, 2, 2д, 3д | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 8.4. | 1. Фразеалогія беларускай мовы паводле паходжання.<br>2. Спрадвечна беларускія і запазычаныя фразеалагізмы.<br>3. Гістарычныя пласты спрадвечна беларускай фразеалогіі.<br>4. Фразеалагічныя калькі.<br>5. Крыніцы беларускай фразеалогіі. | | 1 | | | 2 | Фразеалагічныя слоўнікі. | 1, 2, 2д, 3д | Франтальнае апытванне. Тэрміналагічны дыктант. |
| 8.5. | 1. Парэміялогія.<br>2. Прыказкі і прымаўкі.<br>3. Устойлівыя параўнанні.<br>4. Крылатыя словы, выслоўі і афарызмы.<br>5. Перыфраза. Перыфразы традыцыйныя і індывідуальна-аўтарскія.<br>6. Фразеалагічны аналіз.<br>7. Актуалізацыя і кантроль апорных ведаў, уменняў і навыкаў па тэмах “Фразеалогія”, “Парэміялогія”. | | 2 | | | 2 | Схема фразеалагічнага аналізу. | 1, 2, 2д, 3д | Праверка выкананых заданняў. Кантрольная работа. |
| **9.** | **Лексікаграфія** | **2** | **4** | **2** | | **4** | | | |
| 9.1. | 1. Лексікаграфія як раздзел мовазнаўства.<br>2. Энцыклапедычныя і лінгвістычныя слоўнікі (даведнікі).<br>3. Тыпы лінгвістычных слоўнікаў.<br>4. Будова слоўнікавага артыкула.<br>5. Сістэма граматычных і стылістычных памет.<br>6. Тыпы дэфініцый. | 2 | | | | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| 9.2. | 1. Будова слоўнікавага артыкула ў энцыклапедычных і лінгвістычных слоўніках.<br>2. Сістэма граматычных і стылістычных памет, тыпы дэфініцый у тлумачальных слоўніках.<br>3. Беларускія энцыклапедычныя выданні (універсальныя, галіновыя і персанальныя).<br>4. Беларускія слоўнікі для школ.<br>5. Беларускія фразеаграфічныя слоўнікі.<br>6. Парэміяграфічныя зборнікі (прыказак і прымавак).<br>7. Зборнікі ўстойлівых параўнанняў, крылатых слоў і афарызмаў, перыфраз. | | 2 | | | 2<br>2 | Энцыклапе-дычныя і лінгвістычныя слоўнікі. Парэміяграфіч-ныя выданні. | 1, 2, 2д, 3д | Ушчыльненае апытванне. Праца са слоўнікамі. Праверка выкананых практыкаванняў |
| 9.3. | 1. З гісторыі беларускай лексікаграфіі. Лексікаграфічная праца Ф. Скарыны, Л. Зізанія, П. Бярынды, І. Насовіча, Я. Ціхінскага і інш. “Словарь белорусского наречия” І. Насовіча (1870). Лексікаграфічная праца ў 20 – 30-я гады XX ст. (тэрміналагічныя, перакладныя, дыялектныя слоўнікі). | | 2 | 2 | | | “Словарь белорусского наречия” І. Насовіча (1870). | 1, 2, 2д, 3д | Праца са слоўнікамі. Праверка выкананых заданняў па КСР. |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | |
| **10.** | **Марфеміка** | **2** | **4** | | | **6** | | | |
| 10.1. | 1. Марфеміка як вучэнне аб мінімальных значымых частках слова – марфемах.<br>2. Паняцце марфемы, морфа, аламорфа.<br>3. Марфемная структура слова. | 1 | | | | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| 10.2. | 1. Класіфікацыя марфем.<br>2. Каранёвыя і афіксальныя (службовыя) марфемы.<br>3. Афіксальныя марфемы, іх тыпы.<br>4. Варыянтнасць, сінанімія, полісемія, аманімія, антанімія марфем.<br>5. Аснова слова і яе тыпы.<br>6. Канчатак (флексія), яго роля ў слове. Нулявы канчатак.<br>7. Корань слова. Варыянты (мадыфікацыі, або фанетычныя разнавіднасці) кораня. Свабодныя і звязаныя карані.<br>8. Афіксы (прэфікс, суфікс, постфікс, інтэрфікс, конфікс).<br>9. Словаўтваральныя і формаўтваральныя прыстаўкі і суфіксы. Сінкрэтычныя марфемы.<br>10. Афіксоіды (прэфіксоіды, суфіксоіды) як марфемы пераходнага тыпу. | 1 | | | | 2<br>2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| | 1. Аснова слова і яе тыпы (невытворная і вытворная; аснова словазмянення, формаўтварэння і словаўтварэння; перарывістая і неперарывістая аснова; суплетыўныя асновы).<br>2. Канчатак (флексія), яго роля ў слове. Нулявы канчатак.<br>3. Корань слова. Варыянты (мадыфікацыі, або фанетычныя разнавіднасці) кораня.<br>4. Свабодныя і звязаныя карані.<br>5. Афіксы (прэфікс, суфікс, постфікс, інтэрфікс, конфікс).<br>6. Прыстаўка (прэфікс) і суфікс. Нулявы суфікс.<br>7. Варыянты прыставак і суфіксаў.<br>8. Словаўтваральныя і формаўтваральныя прыстаўкі і суфіксы. | | 2 | | | | Наглядныя матэрыялы па тэме заняткаў. | 1, 2, 2д, 3д | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 10.3. | 1. Змены ў марфемнай структуры слова: апрошчанне, пераракладанне, ускладненне, дэкарэляцыя.<br>2. Прычыны змен у марфемнай будове слова.<br>3. Дээтымалагізацыя.<br>4. Марфемныя слоўнікі.<br>5. Марфемны аналіз слова. | | 2 | | | 2 | Схема марфемнага аналізу. Марфемныя слоўнікі. | 1, 2, 2д, 3д | Франтальнае апытванне. Тэрміналагічны дыктант. |
| **11.** | **Словаўтварэнне** | **6** | **4** | | | **4** | | | |
| 11.1 | 1. Словаўтварэнне як навука. Асноўныя паняцці і адзінкі словаўтварэння. Утваральная аснова (база) і словаўтваральныя сродкі (фарманты).<br>2. Класіфікацыйныя адзінкі словаўтварэння: словаўтваральная пара, словаўтваральны ланцужок, словаўтваральная парадыгма, словаўтваральны рад, словаўтваральнае гняздо.<br>3. Паняцце словаўтваральнага тыпу, словаўтваральнай мадэлі. | 2 | | | | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| 11.2 | 1. Спосабы словаўтварэння.<br>2. Марфалагічнае (марфемнае) словаўтварэнне (афіксацыя).<br>3. Разнавіднасці марфалагічнага словаўтварэння: суфіксальнае, прыставачнае (прэфіксальнае), прыставачна-суфіксальнае, постфіксальнае, прыставачна-постфіксальнае, прыставачна-суфіксальна-постфіксальнае, нульсуфіксальнае. | 2 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| | 1. Складанне і яго разнавіднасці: асноваскладанне, словаскладанне, складана-суфіксальнае словаўтварэнне, абрэвіяцыя і яе разнавіднасці. | | 2 | | | | Наглядныя матэрыялы (па тэме заняткаў. | | Франтальнае апытванне. |
| | 1. Марфалагічна-сінтаксічнае словаўтварэнне (субстантывацыя, ад’ектывацыя, пранаміналізацыя, адвербіялізацыя).<br>2. Лексіка-семантычнае словаўтварэнне.<br>3. Словаўтваральнае калькаванне як адзін са спосабаў лексічнай дэрывацыі.<br>4. Прадуктыўныя і непрадуктыўныя спосабы словаўтварэння. | 2 | | | | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 1, 2, 2д, 3д | |
| | 1. Марфемныя і словаўтваральныя слоўнікі.<br>2. Словаўтваральны аналіз слова.<br>3. Актуалізацыя і кантроль апорных ведаў, уменняў і навыкаў па тэмах “Марфеміка”, “Словаўтварэнне”. | | 2 | | | | Схема словаўтваральнага аналізу. Марфемныя і словаўтваральныя | 1, 2, 2д, 3д | Праца са слоўнікамі Кантрольная работа. |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | слоўнікі. | | |
| | ***Усяго гадзін у 2 семестры: 108 г.*** | ***32*** | ***32*** | ***2*** | ***2*** | ***40*** | | | ***Залік*** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Сучасная беларуская літаратурная мова [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс / склад.: С. С. Мароз [і інш.] // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: https://elib.bspu.by. – Дата доступу: 02.05.2023.
2. Сучасная беларуская літаратурная мова : вучэб. дапам. / Д. В. Дзятко [і інш.] ; пад рэд. Д. В. Дзятко. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 2020. – 588 с.

**Дадатковая літаратура**

1. Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі [Электронны рэсурс] : Закон Рэсп. Беларусь, 23 ліп. 2008 г., № 420-З // Белзакон. – Рэжым доступу: https://belzakon.net/ Законодательство/Закон_РБ/2008/538. – Дата доступу: 02.05.2023.
2. Беларуская мова : энцыкл. давед. / пад агул. рэд. Д. В. Дзятко ; рэдкал.: С. У. Пешын (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2022. – 495 с.
3. Сучасная беларуская мова : вучэб. дапам. / В. У. Азарка [і інш.] ; пад рэд. А. С. Васілеўскай. – Мінск : Рэсп. ін-т праф. адукацыі, 2020. – 383 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Сістэматычна арганізаваная самастойная работа студэнтаў з'яўляецца асноўным сродкам падрыхтоўкі да самастойнай дзейнасці, а змест, метады і формы выступаюць у ролі фактараў, якія ўплываюць на даную падрыхтоўку.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў дзённага аддзялення накіравана на вырашэнне наступных задач:

– паўтарэнне, замацаванне і абагульненне раней атрыманых ведаў;

– удасканаленне прадметных навыкаў, фарміраванне даследчых уменняў і навыкаў;

– актывізацыя вучэбнай і навукова-даследчыцкай дзейнасці студэнтаў;

– фарміраванне гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі.

Крыніцай інфармацыі пры выкананні студэнтамі самастойнай работы могуць выступаць: канспект; друкаваныя матэрыялы; падручнікі і слоўнікі; матэрыялы на электронных носьбітах.

План самастойнай работы прадугледжвае: форму работы, змест (аб'ём) работы, тэрмін выканання, віды кантролю.

У залежнасці ад месца і часу правядзення самастойнай працы, характару кіраўніцтва ёю з боку выкладчыка і спосабу кантролю за яе вынікамі падзяляецца на наступныя віды:

– самастойную працу падчас асноўных аўдыторных заняткаў (лекцый, семінараў);

– самастойную працу пад кантролем выкладчыка ў форме планавых кансультацый, творчых кантактаў, залікаў і экзаменаў;

– пазааўдыторную самастойную працу пры выкананні студэнтамі дамашніх заданняў навучальнага і творчага характару.

Самастойнасць пералічаных вышэй відаў прац досыць умоўная, і ў рэальным адукацыйным працэсе гэтыя віды перасякаюцца адзін з адным.

Самастойная праца студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі дастаткова разнастайная, яна можа прадугледжваць:

– выкананне самастойных прац;

– выкананне кантрольных прац, складанне схем, табліц;

– працу з даведачнай, метадычнай і навуковай літаратурай па мовазнаўстве;

– абарону выкананых прац;

– падрыхтоўку да дыскусій, канферэнцый;

– падрыхтоўку да тэсціравання і інш.

Асноўныя віды заданняўдля самастойнай працы:

– вывучэнне навуковых і вучэбных тэкстаў (падручнікі, першакрыніцы, дадатковая літаратура);

– складанне плана тэксту;

– графічнае адлюстраванне структуры тэксту;

– канспектаванне тэксту;

– праца са слоўнікамі, даведнікамі; азнаямленне з нарматыўнымі дакументамі;

– вучэбна-даследчыцкая дзейнасць;

– выкарыстанне аўдыя- і відэазапісаў.

Для замацавання і сістэматызацыі ведаў, набытых студэнтамі самастойна, выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– праца з канспектам лекцыі (апрацоўка тэксту), паўторная работа над вучэбным матэрыялам (з падручнікаў, першакрыніц, дадатковай літаратуры і інш.);

– складанне планаў і тэзісаў адказаў;

– складанне табліц для сістэматызацыі навучальнага матэрыялу;

– вывучэнне нарматыўных матэрыялаў;

– адказы на кантрольныя пытанні і інш.;

Для фарміравання ўменняў выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– выкананне практыкаванняў па ўзоры;

– рашэнне варыянтных заданняў і практыкаванняў;

– выкананне схем, табліц і пад.;

– рэфлексіўны аналіз прафесійных уменняў з выкарыстаннем аўдыя- і відэатэхнікі і інш.

Сярод канкрэтных відаў самастойнай работы рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя:

а) самастойная работа па ўзоры (перанос вядомага спосабу ў аналагічную сітуацыю);

б) рэканструктыўна-варыятыўная самастойная работа (перанос вядомага спосабу з некаторай мадыфікацыяй у незнаёмую сітуацыю);

в) эўрыстычная самастойная работа (перанос вядомых спосабаў у нестандартную сітуацыю, дзякуючы чаму, самастойная работа набывае даследчы характар).

Для правядзення кантролю самастойнай працы студэнтаў выкарыстоўваюцца:

– праверка індывідуальных заданняў;

– семінарскія заняткі;

– калёквіумы;

– канферэнцыі і інш.

Для кантролю эфектыўнасці арганізацыі самастойнай працы студэнтаў можна праводзіць анкетаванне, падчас якога выяўляецца карыснасць тых ці іншых відаў і арганізацыйных формаў самастойных прац, правільнасць і своечасовасць іх уключэння ў навучальны працэс, дастатковасць метадычнага забеспячэння, адпаведнасць запланаванага часу на іх выкананне і г. д.

Крытэрыямі адзнакі вынікаў самастойнай працы студэнта могуць з’яўляцца:

– узровень засваення студэнтам вучэбнага матэрыялу;

– уменне студэнта выкарыстоўваць тэарэтычныя веды пры выкананні практычных задач;

– абгрунтаванасць і выразнасць выкладу адказу;

– афармленне матэрыялу ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандартаў;

– сфарміраваныя ўменні і навыкі ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі вывучэння дысцыпліны.

Самастойная работа студэнтаў можа быць паспяховай толькі ў выпадку яе правільнай арганізацыі, неабходнага метадычнага суправаджэння, дзейснага кантролю, абавязковай сістэматызацыі, а пры неабходнасці і карэкцыі ведаў, атрыманых студэнтамі самастойна.

Важным змястоўным элементам самастойнай работы з’яўляецца работа студэнтаў над памылкамі, дапушчанымі пры выкананні запланаванай работы. Выкладчык толькі падкрэслівае словы і выразы, у якіх назіраецца памылковае напісанне ці ўжыванне, даючы студэнту магчымасць разабрацца з імі самастойна, г. з. зрабіць гэтыя недахопы аб’ектамі свядомай мэтанакіраванай работы.

# ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ ПА РАЗДЗЕЛАХ "ФАНЕТЫКА. ФАНАЛОГІЯ. АРФАЭПІЯ. ГРАФІКА. АРФАГРАФІЯ" (1 семестр)

***Тэма 1.3.*** Вядомыя беларускія мовазнаўцы, іх навуковая спадчына (І. І. Насовіч, Я. Ф. Карскі, Б. А. Тарашкевіч, М. В. Бірыла, Ф. М. Янкоўскі і інш.).

*Заданне*

I узровень

Законспектаваць з кнігі "Беларуская мова: энцыклапедыя" (Мінск, 1994) адзін энцыклапедычны артыкул пра вядомага беларускага даследчыка і яго навуковую спадчыну (І. І. Насовіч, Я. Ф. Карскі, Б. А. Тарашкевіч, Ф. М. Янкоўскі і інш.).

II узровень

Падрыхтаваць даклад пра вядомага беларускага даследчыка і яго навуковую спадчыну (І. І. Насовіч, Я. Ф. Карскі, Б. А. Тарашкевіч, Ф. М. Янкоўскі і інш.).

III узровень

Падрыхтаваць прэзентацыю "Вядомыя беларускія мовазнаўцы і іх навуковая спадчына" (І. І. Насовіч, Я. Ф. Карскі, Б. А. Тарашкевіч, Ф. М. Янкоўскі і інш.).

***Тэма 6.4.*** Асноўныя правілы беларускай арфаграфіі, заснаваныя на марфалагічным і фанетычным прынцыпах.

*Заданне*

I узровень

З прапанаванага тэксту выпісаць па 5 слоў, правапіс якіх заснаваны на марфалагічным і фанетычным прынцыпах.

II узровень

З прапанаванага тэксту выпісаць па 5 слоў, правапіс якіх заснаваны на марфалагічным і фанетычным прынцыпах. Зрабіць арфаграфічны аналіз трох слоў з тэксту на выбар.

III узровень

З прапанаванага тэксту выпісаць па 5 слоў, правапіс якіх заснаваны на марфалагічным і фанетычным прынцыпах. Да кожнага выпісанага слова падабраць свой прыклад выкарыстання правіла, заснаванага на адпаведным прынцыпе правапісу. Зрабіць арфаграфічны аналіз слоў *трыснёг, па-летняму, сям'я.*

*Тэкст да задання*

Рака шырокая, пакуль што чыстая, трыснёг, лаза і асака абноўлена зялёныя, сонца зноў, як штогоду, грэе па-летняму, і ліпа ў самай квецені, гудзе ад цямна да цямна. Сяджу пад ёю ў халадку, і гуд пчаліны люба пяе ад высокай травы, да якое звісае духмянае голле, і ў самае неба, ажно тая ліпа варушыцца ўся. Пчол, паважаючы працу, баяцца не трэба. Можна зблізку паназіраць, як яны робяць сваё. Бясконцае, нястомнае і вельмі важнае.

Ліпа тут, над ракой, на ўзлессі, не адна. За палянай, дзе пачынаецца белая грэчка, стаяць яшчэ чатыры такія красуні, таксама ў шчодрай духмянасці і неабсяжным гудзе. На адной з дзвюх бліжэйшых ліп хаваецца ў кроне буслянка. Мноства разоў на дзень жыхары яе зверху абмахваюць бела-чорнымі крыламі зялёна-залацісты гуд, то асядаючы на гняздо, то зноў узлятаючы. Сям'я з трыма падлеткамі, што яшчэ чарнадзюба хекаюць ад спёкі і, стоячы ў гняздзе, з трывожнай цікаўнасцю разглядаюць бліжэйшае наваколле. Дрэвы, раку, траву, будынкі леснiковага двара, чырвоныя, сінія, жоўтыя скрыначкі вулляў – усё, над чым так добра і так яшчэ боязна

планіраваць на няўпэўненых, радасных крылах. Далей за ракою – лугі, за імі каласіста-спелыя прасторы палёў, якія цяпер, амаль апоўдні, у парнай смузе. У другім баку, за леснічоўкай, зялёнае мора хвойных і лісцяных вяршыняў – пушча. Ды ўсё гэта для буслянят – тое “вельмі далёка”, што яшчэ будзе ў вялікім, хвалюючым іхнім “пасля”.

Янка Брыль. “Золак, убачаны здалёк”.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ ПА РАЗДЗЕЛАХ “ЛЕКСІКА. ФРАЗЕАЛОГІЯ. ЛЕКСІКАГРАФІЯ. МАРФЕМІКА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ” (2 семестр)

***Тэма 7.10.*** Стылістычнае выкарыстанне ўстарэлых слоў. Гістарычныя слоўнікі. Развіццё лексікі беларускай мовы. Крыніцы і шляхі ўзбагачэння літаратурнай лексікі.
*Заданне*
I узровень
Са “Слоўніка архаізмаў і гістарызмаў (па творах беларускай мастацкай літаратуры і публіцыстыкі)” С. Струкавай (Мінск, 2007) выпісаць асобна па 5–7 слоўнікавых артыкулаў з архаізмамі і па 5–7 слоўнікавых артыкулаў з гістарызмамі.
II узровень
З “Гістарычнага слоўніка беларускай мовы” выпісаць 20 слоўнікавых артыкулаў з гістарызмамі, аб’яднаных адной тэмай. Скласці міні-слоўнік выпісаных лексічных адзінак.
III узровень
З мастацкіх твораў У. Арлова, В. Іпатавай, Л. Рублеўскай і інш. выпісаць тэксты з устарэлымі словамі. Па “Слоўніку архаізмаў і гістарызмаў (па творах беларускай мастацкай літаратуры і публіцыстыкі)” С. Струкавай (Мінск, 2007) вызначыць семантыку гістарызмаў і архаізмаў.

***Тэма 9.3.*** З гісторыі беларускай лексікаграфіі. Лексікаграфічная праца Ф. Скарыны, Л. Зізанія, П. Бярынды, І. Насовіча, Я. Ціхінскага і інш. “Словарь белорусского наречия” І. Насовіча (1870). Лексікаграфічная праца ў 20–30-я гады ХХ ст. (тэрміналагічныя, перакладныя, дыялектныя слоўнікі).
*Заданне*
I узровень
Заканспектаваць артыкул Д. В. Дзятко “Гісторыя беларускай лексікаграфіі” // “Беларуская мова: энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў”, т. 7 (Мінск, 2017).
II узровень
Падрыхтаваць даклад на тэму “Лексікаграфічная праца Ф. Скарыны, Л. Зізанія, П. Бярынды, І. Насовіча, Я. Ціхінскага і інш.”.
III узровень
Падрыхтаваць прэзентацыю “Лексікаграфічная праца ў 20–30-я гады ХХ ст. (тэрміналагічныя, перакладныя, дыялектныя слоўнікі)”.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

### 1 семестр

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | К-сць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1.1. | Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры. | 2 | Падрыхтаваць даклад “Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры”. | Даклад |
| 1.2. | Нормы беларускай літаратурнай мовы (арфаэпічныя, арфаграфічныя, лексічныя, граматычныя, пунктуацыйныя, стылістычныя). | 2 | Падрыхтаваць канспект артыкула Т. І. Тамашэвіч “Нормы літаратурнай мовы” // “Беларуская мова: энцыклапедыя” (Мінск, 1994). | Канспект |
| 1.3. | Беларуская літаратурная мова на сучасным этапе. | 4 | Падрыхтаваць прэзентацыю “Беларуская літаратурная мова на сучасным этапе” . | Прэзентацыя |
| 2.1. | Паняцце гука, аспекты яго характарыстыкі (акустычны (фізічны), артыкуляцыйны, функцыянальны). | 2 | Падрыхтаваць канспект §§ 65 – 66 // “Сучасная беларуская літаратурная мова. Лексікалогія. Фанетыка. Арфаграфія : вучэб. дапам.” (Мінск, 1993). | Канспект |
| 2.2 | Артыкуляцыйная характарыстыка гукаў. Галосныя і зычныя гукі. | 2 | Падрыхтаваць канспект па тэме “Галосныя і зычныя гукі”, выкарыстоўваючы навуковае выданне “Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў. У 12 т. Т.7. Беларуская мова” (Мінск, 2017). | Канспект |
| 2.3. | Галосныя гукі і іх класіфікацыя. Зычныя гукі і іх класіфікацыя. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванні № 183 і № 204 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванні |
| 2.6. | Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні галосных. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 187 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 2.6. | Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні зычных. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 205 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 2.7. | Артыкуляцыйная (экспіраторная) і акустычная (санорная) тэорыі склада. | 2 | Падрыхтаваць даклад “Артыкуляцыйная (экспіраторная) і акустычная (санорная) тэорыі склада”. | Даклад |
| 2.7. | Складападзел. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 222 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 2.8. | Націск як сродак размежавання слоў і | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 224 // “Сучасная беларуская | Практыка-ванне |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | формаў слоў. | | літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | |
| 2.10. | Фанетычная транскрыпцыя тэкстаў розных стыляў. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 211 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 2.11 | Фанетычны аналіз як від моўнага аналізу. Фанетычны аналіз. | 2 | Падрыхтаваць канспект § 2.13 // “Сучасная беларуская літаратурная мова : вучэб. дапам.” пад рэд. Д. В. Дзятко (Мінск, 2017). | Канспект |
| 3.1. | Дыферэнцыйныя (фаналагічна істотныя, сэнсаадрознівальныя) і інтэгральныя (тоесныя, агульныя) прыметы фанем. | 2 | Падрыхтаваць канспект § 2.11 // “Сучасная беларуская літаратурная мова : вучэб. дапам.” пад рэд. Д. В. Дзятко (Мінск, 2017). | Канспект |
| 3.3. | Сістэма зычных фанем у беларускай мове. Сістэма галосных фанем у беларускай мове. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 218 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 4.1. | Арфаэпічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. | 2 | Заканспектаваць раздзелы з кнігі “Беларускаелітаратурнае вымаўленне” / Ф. М. Янкоўскі (Мінск, 1976) пра асаблівасці вымаўлення зычных гукаў і спалучэнняў зычных гукаў у беларускай мове. | Канспект |
| 4.2. | Вымаўленне націскных і ненаціскных галосных Вымаўленне зычных і спалучэнняў зычных. Вымаўленне некаторых граматычных формаў. Фанетычная транскрыпцыя. | 2 | Падрыхтаваць канспект па тэме “Фанетычная транскрыпцыя”, выкарыстоўваючы навуковае выданне “Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў. У 12 т. Т.7. Беларуская мова” (Мінск, 2017). | Канспект |
| 4.3 | Прычыны адхіленняў ад нормаў беларускага літаратурнага вымаўлення. Даведнікі па беларускай арфаэпіі. | 4 | Падрыхтаваць канспект па тэме “Прычыны адхіленняў ад нормаў беларускага літаратурнага вымаўлення”, выкарыстоўваючы навуковае выданне Ф. М. Янкоўскага “Беларускае літаратурнае вымаўленне” (Мінск, 1976). | Канспект |
| 5.1 | Графіка як раздзел мовазнаўства. Беларускі алфавіт. Суадносіны літар і гукаў. Гукавы і складовы прынцыпы беларускай графікі. | 2 | Падрыхтаваць канспект па тэме “Беларускі алфавіт”, выкарыстоўваючы навуковае выданне “Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў. У 12 т. Т.7. Беларуская мова” (Мінск, 2017). | Канспект |
| 5.2. | З гісторыі беларускай графікі. | 2 | Падрыхтаваць канспект артыкула А. І. Яновіч “Станаўленне графічнай сістэмы беларускай літаратурнай | Канспект |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | мовы новага перыяду” // “Беларуская мова: хрэстаматыя” (Мінск, 2005). | |
| 6.1. | Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 238 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 6.3. | З гісторыі беларускай арфаграфіі. Станаўленне сучаснай беларускай арфаграфічнай сістэмы. | 4 | Падрыхтаваць канспект артыкула Д. В. Дзятко “Арфаграфія” // “Беларуская мова: энцыкл. для школьн. і студ.”, т. 7 (Мінск, 2017). | Канспект |
| 6.5. | Арфаграфічныя слоўнікі і даведнікі. | 2 | Падрыхтаваць даклад па тэме “Арфаграфічныя слоўнікі і даведнікі”, выкарыстоўваючы вучэбны дапаможнік “Сучасная беларуская літаратурная мова : вучэб. дапам.” пад рэд. Д. В. Дзятко (Мінск, 2017). | Даклад |

## 2 семестр

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | К-сць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 7.2 | Тыпы лексічных значэнняў слова паводле функцыі: намінатыўнае, эмацыяналь-на-ацэначнае, паводле лек-січнай спалучальнасці: сва-боднае і несвабоднае (фра-зеалагічна звязанае, сінтак-січна абумоўленае, канструктыўна абмежа-ванае). | 2 | Прачытаць у “Сучаснай беларускай літаратурнай мове: Спрэчныя пытанні” / І. Я. Лепешаў (Гродна, 2002) пра тыпы лексічных значэнняў слова. Скласці тэзісы паводле прачытанага матэрыялу. | Тэзіснае канспекта-ванне |
| 7.5. | Слоўнікі амонімаў і паронімаў. | 2 | Выпісаць са “Слоўніка амонімаў беларускай мовы” / В. Д. Старычонак (Мінск, 1991) і “Слоўніка паронімаў беларускай мовы” / С. М. Грабчыкаў (Мінск, 1994) па 5 слоўнікавых артыкулаў амонімаў і паронімаў, скласці з выпісанымі амонімамі і паронімамі сказы. | Праца са слоўнікамі, практыка-ванне |
| 7.7. | Стылістычнае выкарыстанне антонімаў (антытэза і аксюмаран). | 2 | Падабраць і выпісаць з мастацкіх твораў сказы з прыкладамі выкарыстання аўтарамі антытэзы і аксюмарана. | Картатэка моўных фактаў |
| 7.8. | Запазычанні з неславянскіх моў (грэчаскай, лацінскай, французскай, нямецкай, англійскай, італьянскай і | 4 | Выпісаць са “Слоўніка іншамоўных слоў: у 2-х т.” / А. М. Булыка (Мінск, 1999) па 5 прыкладаў запазычаных слоў з грэчаскай, лацінскай, | Праца са слоўнікам, практыка-ванне |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | інш.), іх прыметы. | | французскай, нямецкай, англійскай, італьянскай і інш. моў, вызначыць прыметы запазычання. | |
| 7.9. | Дыялектызмы, іх тыпы (лексічныя, семантычныя, фанетычныя, граматычныя, словаўтваральныя). | 2 | Падабраць і выпісаць з твораў двух-трох вядомых беларускіх пісьменнікаў сказы з дыялектызмамі. Па дыялектных слоўніках вызначыць іх лексічнае значэнне. | Картатэка моўных фактаў, праца са слоўнікамі |
| 7.10. | Неалагізмы, шляхі іх узнікнення. | 4 | Падрыхтаваць прэзентацыю “Неалагізмы, шляхі іх узнікнення”. | Прэзента-цыя. |
| 8.1. | Мнагазначнасць, аманімічнасць, сінанімічнасць і антанімічнасць фразеалагізмаў. | 2 | Прачытаць у “Фразеалогіі сучаснай беларускай мовы” / І. Я. Лепешаў (Мінск, 1998) пра мнагазначнасць, аманімічнасць, сінанімічнасць і антанімічнасць фразеалагізмаў. Скласці тэзісы паводле прачытанага матэрыялу. | Тэзіснае канспекта-ванне |
| 8.4 | Фразеалогія беларускай мо-вы паводле паходжання. Спрадвечна беларускія і запазычаныя фразеала-гізмы.Гістарычныя пласты спрадвечна беларускай фра-зеалогіі.Фразеалагічныя калькі.Крыніцы беларускай фразеалогіі. | 2 | Прачытаць у “Фразеалогіі сучаснай беларускай мовы” / І. Я. Лепешаў (Мінск, 1998) пра ўтварэнне фразеалагізмаў і іх этымалагічную класіфікацыю. Скласці тэзісы паводле прачытанага матэрыялу. | Тэзіснае канспекта-ванне |
| 8.5. | Крылатыя словы, выслоўі і афарызмы. Перыфраза. Перыфразы традыцыйныя і індывідуальна-аўтарскія. | 2 | Зрабіць пісьмовы параўнальны аналіз лексікаграфічных выданняў “Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў” / Н. В. Гаўрош, Н. М. Нямковіч (Мінск, 2012) і “Крылатыя словы і афарызмы: З літаратурных крыніц” / Ф. М. Янкоўскі (Мінск, 1960). Выпісаць з названых выданняў па 10 крылатых выслоўяў, прысвечаных важнасці чалавека, яго жыцця і будучыні. | Аналіз слоўнікаў, праца са слоўнікамі, картатэка моўных фактаў |
| 9.2. | Беларускія слоўнікі для школ (тлумачальныя, пе-ракладныя, арфаграфічныя, марфемныя, словаўтва-ральныя, фразеалагічныя і інш.). | 2 | Прааналізаваць пісьмова слоўнікі беларускай мовы для школ, апісаць структуру слоўнікаў і будову слоўнікавых артыкулаў, выпісаць прыклады слоўнікавых артыкулаў з усіх прапанаваных слоўнікаў. | Праца са слоўнікамі |
| 9.2. | Беларускія фразеаграфіч-ныя слоўнікі. Парэміягра-фічныя зборнікі (прыказак і прымавак). Зборнікі ўстой-лівых параўнанняў, крыла-тых слоў і афарызмаў, перыфраз. | 2 | Падрыхтаваць даклады: “Беларускія фразеаграфічныя слоўнікі”, “Беларускія парэміяграфічныя зборнікі”, “Беларускія зборнікі ўстойлівых параўнанняў, крылатых слоў і афарызмаў, перыфраз”. | Даклады |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 10.2. | Варыянтнасць, сінанімія, полісемія, аманімія, антанімія марфем. | 2 | Падрыхтаваць канспект § 18 “Аманімія, мнагазначнасць і сінанімія марфем” // Шакун, Л. М. Словаўтварэнне : вучэб. дапам. для ВНУ / Л. М. Шакун. – Мінск : Выш. школа, 1978. | Канспект |
| 10.2. | Афіксоіды (прэфіксоіды, суфіксоіды) як марфемы пераходнага тыпу. | 2 | Падрыхтаваць канспект § 10 “Афіксоіды” // Шакун, Л. М. Словаўтварэнне : вучэб. дапам. для ВНУ / Л. М. Шакун. – Мінск : Выш. школа, 1978. | Канспект |
| 10.3. | Прычыны змен у марфемнай будове слова. | 2 | Падрыхтаваць канспект § 25 “Гістарычныя змены ў марфемным складзе слоў” // Шакун, Л. М. Словаўтварэнне : вучэб. дапам. для ВНУ / Л. М. Шакун. – Мінск : Выш. школа, 1978. | Канспект |
| 11.2. | Разнавіднасці марфала-гічнага словаўтварэння: суфіксальнае, прыставачнае (прэфіксальнае), прыста-вачна-суфіксальнае, пост-фіксальнае, прыставачна-постфіксальнае, прыста-вачна-суфіксальна-постфік-сальнае, нульсуфіксальнае. | 2 | Выпісаць са “Словаўтваральнага слоўніка” / А. М. Бардовіч, М. М. Круталевіч, А. А. Лукашанец (Мінск, 2000) па 2–3 прыклады на ўсе падтыпы марфалагічнага спосабу словаўтварэння. | Праца са слоўнікам |
| 11.2. | Прадуктыўныя і непрадуктыўныя спосабы словаўтварэння. | 2 | Падрыхтаваць канспект § 40 “Прадуктыўнасць словаўтваральных тыпаў і індывідуальная словатворчасць” // Шакун, Л. М. Словаўтварэнне : вучэб. дапам. для ВНУ / Л. М. Шакун. – Мінск : Выш. школа, 1978. | Канспект |

# ЗАДАННІ ДА РЭЙТЫНГАВЫХ КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ

## Рэйтынгавая кантрольная работа № 1

### Варыянт 1

*Заданні:*

1. Запішыце тэкст пад дыктоўку.
2. Зрабіце фанетычны аналіз выдзеленых слоў.

На змярканні з-за лесу напаўзлі шызыя змрочныя хмары. Сваім шчыльным цяжарам яны зусім загрувасцілі неба, затулілі блішчастую шчыліну над касагорам; стала пагрозліва, трывожна і ***сцюдзёна***[1 варыянт]. Вецер з шалёнай восеньскай лютасцю абтрасаў бярозы над шляхам, церабіў, вымятаў ***лісцвяны***[2 варыянт] маладняк прысадаў, гнаў цераз чыгунку ў шэрую далеч шапатлівыя статкі лісця. Каламутная вада ў лужыне ад напору ветру аж выплёсквалася з дарогі і пырскала на ўзмежак сцюдзёнымі бруднымі кроплямі.

Байцы на пераездзе рупна ўляглі ў работу – капалі, дзяўблі, угрызаліся ў сцвярдзелую залеж зямлі. Пшанічны ледзь не па самыя плечы закапаўся ў рудую кучу гліны; далёка навокал адкідваючы рассыпастыя камякі, зухавата і весела асталёўваўся разгарачаны Свіст. Ён зняў з сябе ўсе папругі і вопратку і, застаўшыся ў гімнасцёрцы, спрытна сыпаў з яміны малой пехацінскай лапаткай. У дваццаці кроках ад яго, таксама над ***лініяй***[1 варыянт], час ад часу спыняючыся, адпачываючы і аглядваючыся на сяброў, крыху з меншым стараннем акопваўся Аўсееў. Ля самай будкі спрактыкавана ладзіў кулямётную пазіцыю старшына Карпенка; на другі бок ад яго старанна ***дзёўб***[2 варыянт] зямлю расчырванелы, потны Глечык. Нарыхліўшы жалезінай грунт, хлопец рукамі выкідваў яго, пасля прыгаршчамі выгортваў пясок і зноў дзёўб. Адзін толькі Фішар без справы самотна сядзеў у быльнягу, дзе яго пакінуў старшына, і, тулячы ў рукавы азяблыя рукі, гартаў нейкую кніжку.

За гэтым заняткам і ўбачыў яго Карпенка, калі, прыпыніўшы працу, выйшаў з-за старажоўкі (213 слоў).

Васіль Быкаў. “Жураўліны крык”.

*Заданні:*

1. Зрабіць фанетычны аналіз слова.

   Авадзень.
2. Запісаць словы і спалучэнні слоў у фанетычнай транскрыпцыі.

   Счэпшчык, з кім, волжскі, перад імі, слёзы і смех, без сонца, змярцвелы, з жыта, насміхаешся, адчайна.
3. Выявіць памылкі, калі яны ёсць, у фанетычнай транскрыпцыі, выправіць іх і запісаць гукі і спалучэнні гукаў правільна.

   Разво[дз']е, на кла[тц]ы, фу[т]бол, такая [у]ніверсальная, [с] жалудамі, ва[к]зал, бя[ш]умна, сма[ш]ны, па[д]кормка, ад'е[зд].

### Варыянт 2

1. Зрабіць фанетычны аналіз слова.

   Аварыя.
2. Запісаць словы і спалучэнні слоў у фанетычнай транскрыпцыі.

   У дзежцы, не сустракаешся, па іголку, з'есці, вазьму і заспяваю, латышскі,

расшчэплены, жаніцьба, бязлітасна, з іхнімі.

3. Выявіць памылкі, калі яны ёсць, у фанетычнай транскрыпцыі, выправіць іх і запісаць гукі і спалучэнні гукаў правільна.

Пака[сч]ык, [н'э] быць ёй, [з]'ява, кнігі [і] [с]шыткі, сусе[тс]кі, па[тч]ас, [с']кінуць, [с]мела[с]ць, лі[ч]ба, ня[с]ві[сс]кі.

## Рэйтынгавая кантрольная работа № 2

*Заданні:*

### Варыянт 1

*1. Выпішыце з тэксту спачатку словы з арфаграмамі, заснаванымі на фанетычным прынцыпе, потым словы з арфаграмамі, заснаванымі на марфалагічным прынцыпе правапісу.*

Назаўсёды, да апошняга дыхання пасялілася ў маю душу любоў да хлебаносных камячкоў глебы на роднай ніве, да груш на ўзмежках і пры дарогах, да крыніц і ўзгоркаў. Да хлебароба і настаўніка. Да матчынага слова. Да найвялікшай, нашай, беларускай далікатнасці – ратаваць чалавека, калі яму цяжка, калі яму трэба спагада, кубак крынічнай вады. Супакоіць і прагнаць смагу, агледзець і загаіць рану, выратаваць (Ф. Янкоўскі).

2. *Запішыце словы, устаўце прапушчаныя літары. Арфаграмы, заснаваныя на фанетычным прынцыпе, падкрэсліце адной рыскай, на марфалагічным – дзвюма.*

За…граць, Лю…міла, с…ржант, ра…ольнік, у…чуваць, па…за, характ…рыстыка, д…браякасны, рацы…нальны, ба…вінне, ад…ютант, п…ўнагалоссе.

*3. Запішыце словы па-беларуску ў алфавітным парадку.*

Теорема, комод, национальный, адрес, лотерея, диалектика, мягкий, йодистый, шепелявo, стационар, дискуссия, легенда, кофе.

### Варыянт 2

*1. Выпішыце з тэксту спачатку словы з арфаграмамі, заснаванымі на фанетычным прынцыпе, потым словы з арфаграмамі, заснаванымі на марфалагічным прынцыпе правапісу.*

З тымі трыма дарогамі, якія столькі разоў беглі насустрач Апейку, якія ён асабліва ведаў, была яшчэ адна, таксама важная, але непадобная ні на адну з трох. Яна пачыналася каля рачнога маяка на пясчаным беразе Прыпяці і вяла ў "акругу", у гарбаты, то па-сяброўску ветлівы, то дзелавіта строгі Мазыр. Працавіты, белы "Чычэрын".. з мая, калі сыходзіла разводдзе, да позняй восені з аднолькавай ахвотай нёс і на нарады, і на суровыя справаздачы. Зімой, па аснежанай рацэ, была самая роўная і самая зручная санная дарога: сані дабягалі да акруговага горада весялей і спарней, як па беразе… (І. Мележ)

*2. Запішыце словы, устаўце прапушчаныя літары. Арфаграмы, заснаваныя на фанетычным прынцыпе, падкрэсліце адной рыскай, на марфалагічным – дзвюма.*

Старадаро…скі, за…нець, кал…кві…м, Брэс…чына, дасве…чаны, аб…сці, н…стрымана, мно…тва, узбе…кі, ра…чышчаны, выкр…слены, грама…ства.

*3. Запішыце словы па-беларуску ў алфавітным парадку.*

Реагировать, филиал, почерк, чемодан, кефир, обелиск, аквариум, гигиена, иероглиф, грандиозный, температура, подойти, дефект.

# ЗАДАННІ ДА КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ

## Кантрольная работа № 1 (2 семестр)

*Заданні:*

1. Выканайце тэставыя заданні.

*Варыянт 1*

1. Адзначце, якая лінгвістычная дысцыпліна займаецца вывучэннем паходжання слоў:
1) семасіялогія;
2) анамастыка;
3) этымалогія;
4) стылістыка;
5) тапаніміка.

2. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні:
1) З Рэем звязана *старонка* жыцця, пачатак якой не хацелася б успамінаць (І.Навуменка);
2) Далёка ўнізе ляжала даліна. Здавалася, горы нарэшце разамкнулі сваю каменную *пашчу*, набраўшыся золкага, непрыветна агромністага камення (В.Іпатава);
3) Ноч выдалася зорная, ціхая, вада паўз берага *маўчала* (В.Карамазаў);
4) Сонца ўзыходзіць, *падымаецца* ў сінечы неба, толькі зрэдку адзначанай нерухомымі аблачынкамі (І.Навуменка);
5) Каму ў жыцці прапасці, каму не зжыць нягод… *Клубок* людскіх няшчасцяў цяжэе з году ў год (Т.Бондар).

3. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы выкарыстоўваюцца ў сінтаксічна абумоўленым значэнні:
1) Аднак, калі была прызначана адпраўка ў партызанскую зону, Варвара ўжо рухацца не магла, не вытрымала б і *малая* нават перавозкі (М.Лужанін);
2) На дапамогу дзе тут спадзявацца, не кожны з натоўпу мог даць *рады* самому сабе (М.Лужанін);
3) – О, у нас тутака ў гучныя справы людзі трубяць… Дык чаго ж ты сядзіш, *галубок*? – спахватваецца бабка (М.Лужанін);
4) Шчасця не бачым, а жывём зубы *сашчапіўшы* (М.Лужанін);
5) У кватэры было ціха, вельмі ціха для жытла амаль у цэнтры вялікага горада. За сталовай спалі ў сваім хлапечым пакойчыку сыны-*блізняткі*, Міколка і Раман, жонка пазаўчора адбыла на паўднёвыя воды (М.Лужанін).

4. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца метафарамі:
1) Па рацэ плылі белыя параходы, сцягваючы з берагоў і вады ранішні *сырадой* туманаў, валаклі за сабою ўсё роўна як даўжэзныя сеці, поўныя жывога сонечнага срэбра (В.Карамазаў);
2) Толькі недзе за Грабянцамі, за старасвецкімі ліпамі, што невыразна чарнелі ўдалечыні, край неба завалакло бураватай шэранню, а яе калматыя *языкі* выцягваліся ў адным кірунку – за ветрам (М.Кусянкоў);
3) “Усім добрым ва мне я абавязаны кнігам”. Услед за Горкім так могуць сказаць дый кажуць многія, кожны па-свойму. І я ўжо нямала пра гэта пісаў, аднак сказаў, здаецца часамі, далёка не ўсё. Бо і пра кнігу, як пра маці – зноў жа *згадаем Горкага,* – можна расказваць бясконца (Янка Брыль);
4) Як апошні хутаранец, на сядзібе *крэкча* дуб (М.Мятліцкі);
5) Месяц сцежку ў дубняк *залівае* халодным праменнем; не магу аніяк я уласным асвойтацца ценем (А.Куляшоў).

5. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца сінекдахамі:
1) Мне трэба было пабываць у Франкфурце-на-Майне ўжо для таго, каб пабачыць у адным з сабораў выяву тайнай *вячэры* – невялічкі барэльеф на белай сцяне (С.Рублеўскі);
2) З вішняку, усыпанага ўжо добра чырвонымі *вішнямі*, паспешліва зрываліся шпакі і чорнымі хмурынкамі сігалі ўвысь і чамусьці ў той бок, куды ішлі камбайны (І.Стадольнік);
3) Сапраўды, Біблія сабрала і з'яднала магутную дружыну. На яе аснове і вырасла Астрожская славяна-грэка-лацінская *акадэмія* (А.Петрашкевіч);
4) На вяселлі іграць гарманіст не згадзіўся, і *вёска аб’явіла* таксама байкот – пуста ў хаце, ад бацькоў адвярнуўся народ, ад сватоў і ад сваццяў (А.Куляшоў);
5) *Лапці, світкі* зрэбныя – з нашых сёл якраз, на заробкі хлебныя *ездзілі* ў Данбас (А.Куляшоў).

6. Адзначце няпоўныя лексічныя амонімы:
1) выслаць ліст – выслаць санкі сенам;
2) векавы бор – бор з’яўляецца трохвалентным кампанентам;
3) брадзіць па вуліцы – варэнне пачало брадзіць;
4) коркавая падэшва – коркавае рэчыва;
5) пералёт птушак – цвіце пералёт жоўтымі кветкамі.

7. Адзначце амафоны:
1) змешаны лес – лез на турнік;
2) нябесны гром – грам цукру;
3) пара дадому – пара ад кіпеню;
4) род Радзівілаў – рот адкрыты;
5) крапіва пякучая – Крапіва-байкапісец.

8. Адзначце прыказкі, у якіх ужываюцца антонімы.
1) За аднаго бітага двух нябітых даюць.

2) Дзень мала, а два многа.
3) Ад вялікага да смешнага адзін крок.
4) Авечку стрыгуць, а баран дрыжыць.
5) Добрая слава на паліцы ляжыць, а благая па дарожцы бяжыць.

9. Адзначце аднакаранёвыя антанімічныя пары:
1) павага – знявага;
2) людзі – нелюдзі;
3) зашпіліць – расшпіліць;
4) дужы – слабы;
5) днём – ноччу.

10. Адзначце рады слоў, у якіх ужываюцца толькі семантычныя сінонімы:
1) газета, шматтыражка, насценгазета;
2) гаворка, гутарка, размова;
3) цвёрды, зацвярдзелы, скамянелы;
4) яма, варонка, глінішча, катлаван;
5) стрэльба, вінтоўка, карабін, абрэз, двухстволка.

11. Адзначце групы слоў з аднолькавым лексічным значэннем:
1) столькі – столкі;
2) дырэктарка – дырэктрыха;
3) канешне – канечне;
4) патушыць – затушыць;
5) мовазнавец – мовазнаўца.

12. Адзначце пары слоў, якія з'яўляюцца абсалютнымі сінонімамі:
1) стог – сціртa;
2) стос – стус;
3) сталічны – стольны;
4) стаматолаг – дантыст;
5) цаляць – меціць.

13. Адзначце пары слоў, якія з'яўляюцца паронімамі:
1) палаткавы – палатачны;
2) маёмасны – маёмны;
3) ілюстрыраваць – ілюстраваць;
4) імігрант – эмігрант;
5) жняя – жнейка.

14. Адзначце пары словазлучэнняў, у склад якіх уваходзяць міжмоўныя амонімы:
1) серый мех – мех з жытам;
2) полить цветы – паліць грубку;
3) поплавок удочки – на паплавах ракі;
4) родить двойню – радзіць сябру;
5) зерно риса – рыса характару.

15. Адзначце сказы, у якіх дапушчана памылка ва ўжыванні слова:
1) Да мачанкі маці пякла яшчэ і бліны з грэчкавай або ячнай мукі (А.Якімовіч);
2) Вясёлыя, задорлівыя прыпеўкі рэхам адгукаліся ў бары (М.Ваданосаў);
3) Холад настойліва забіраўся пад майкі і ледзяніў цела (У.Карпаў);
4) Левандоўскі якраз два дні таму назад вярнуўся з міграцыі (А.Карпюк);
5) Бачачы, як павесялелі дарослыя, сталі радавацца і дзеці (І.Мележ).

16. Адзначце тыпы сінонімаў:
1) узуальныя;
2) маўлення;
3) аказіянальныя;
4) моўныя;
5) уласналексічныя.

17. Адзначце сказы з аксюмаранам:
1) Наперад не вырывайся і ззаду не заставайся;
2) Па адзежы сустракаюць, а па розуму праводзяць;
3) Хвалілася сініца мора падпаліць;
4) Хто чужога не шкадуе, той свайго не мае;
5) Ціхая вада берагі мые.

*Варыянт 2*
1. Адзначце, які раздзел мовазнаўства займаецца вывучэннем значэння слова:
1) семасіялогія;
2) анамастыка;
3) этымалогія;
4) стылістыка;
5) тапаніміка.

2. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў прамым значэнні:
1) Сонечныя плямы дзе сплываліся і ярчэлі, дзе *рассыпаліся* і *гаслі*, а блакіт заставаўся трывалы і чысты (В.Карамазаў);
2) Халодныя, нізкія, набрынялыя вільгаццю воблакі позняй восені *плылі,* здавалася, па самай вуліцы (Я.Сіпакоў);
3) Абапал сцежкі, у не зусім спалавелым саламяным гушчары, сям-там *праглядвае* рамонак, большыя сонейкі якога наіўна пнуцца ўгару, некаторыя нават даволі высока, а дробязь цвіце, адцвітае ды пахне понізу (Янка Брыль);
4) Рассеяны позірк яго [Гулівера] *заблытаўся* недзе ў бухматым сасновым голлі, а можа, сягаў і вышэй, і ніхто не змог бы дакладна сказаць, пра што думае ў гэтым лесе высокі ў літаральным і пераносным сэнсе прадстаўнік маскоўскага “Леспраекта” (М.Кусянкоў);
5) Васіль пасядзеў на ганку, паслухаў, як трашчаць вераб’і ў густым вішанніку, клююць пераспелыя ягады, затым замкнуў дзверы, схаваў, як *наказала* Аляксандра, ключ пад ганак і выйшаў на вуліцу (І.Навуменка).

3. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў несвабодным значэнні:
1) Калі *стаў* на якую дарогу – так лёгенька не сіступіш (М.Лужанін);
2) Мой Карней, тры гады па тым, *пераехаў* назусімнае векаванне, пад бярэзіну на могліцах. І я хутка следам за дзедам (М.Лужанін);
3) Усё настойлівей і настойлівей хадзілі *чуткі*, што неўзабаве выйдзе царскі маніфест, які адпусціць сялян на волю (Я.Сіпакоў);
4) А ўсяго і здарылася: матуля *наступіла* на хвост нашаму шэраму катку, які, улагоджаны пачастункам, усеўся на шырокай маснічыне пасярод трысцена (С.Рублеўскі);
5) Зіма неяк адразу вушы апусціла, зямлю нават па начах не трымае ў сваіх кіпцях, вясна разгулялася, баль *правіць* дзень і ноч (В.Карамазаў).

4. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца метаніміямі:
1) У клубе часта бывае кіно, сяды-тады наладжваюцца спектаклі, *выступае* свая і прыезджая *самадзейнасць*, а найчасцей, вядома, танцы (Янка Брыль);
2) Алекса зірнуў вакол – відаць, на той гары раслі такія ж каржакаватыя, падобныя да полацкіх соснаў магутныя дрэвы з пушыстымі мяцёлкамі светла-зялёных *іголак* (В.Іпатава);
3) Мы *пазычалі Гогаля* і тады, калі я, найменшы ў хаце, толькі гартаў тую вялікую, тоўстую кнігу, бясконца гледзячы цацкі-малюнкі, тлумачэнні да якіх сяды-тады давалі старэйшыя (Янка Брыль);
4) Прайшоўшыся па пакоі, затрымаўся перад камінам, паглядзеў на вазачку, у якой, прытуліўшыся галоўкай да галоўкі, нібы цнатлівыя паннaчкі, стаялі грацыёзныя фіялкі, здзівіўся: якая вытанчаная *гармонія* жывое натуры! (В.Карамазаў);
5) Пасля *перамогі над Гітлерам* пражыта так многа, што мне часамі хочацца перанесціся нейкім цудам з вялікага шумнага горада (Янка Брыль).

5. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца сцёртымі метафарамі:
1) *Над Горкім* добра думаецца пра пражытае (Янка Брыль);
2) Сонца горача сёння *пячэ*, а дарога лягла ад сяла да сяла і яшчэ ад сяла да сяла (А.Куляшоў);
3) Жыццё ж *ідзе* і, згодна запаветам, не выракаецца сваіх асноў (Т.Бондар);
4) Ужо *стаяла*, можна сказаць, позняя раніца (І.Чыгрынаў);
5) З канаплёўскага канца Верамеек дарога ў Бабінавічы спярша *вяла* праз Халахонава хацішча (І.Чыгрынаў).

6. Адзначце поўныя лексічныя амонімы:
1) грэнландскі кіт – кіт служыць замазкай для шкла;
2) юшкай закладваюць комін – юшку вараць з рыбы;
3) кладка праз яр – зялёны яр;
4) чорныя плямы – гуляць чорнымі;
5) утушыць агонь – утушыць мяса.

7. Адзначце амаформы:
1) тры падлогу – тры сябры;
2) клуб дыму – спартыўны клуб;
3) люблю збіраць дажджавікі – апранаю дажджавік;
4) лячу дзяцей – лячу ў нябёсы;
5) еду ў Буду – буду шукаць.

8. Адзначце прыказкі, у якіх ужываюцца антонімы:
1) Кінь перад сабою, знойдзеш за сабою;
2) Не ён першы, не ён апошні;
3) Служка ў лапцях, а я (пан) босы;
4) Усё мінаецца, а праўда застаецца;
5) Баба ў хаце тры вуглы трымае, а мужчына адзін.

9. Адзначце рознакаранёвыя антанімічныя пары:

1) гаваркі – маўклівы;
2) апрануты – распрануты;
3) аптыміст – песіміст;
4) адчаліць – прычаліць;
5) даць – узяць.

10. Адзначце рады слоў, у якіх ужываюцца толькі стылістычныя сінонімы:
1) галава, кумпал, мазгаўня, кацялок, манерка, голаў;
2) звычай, завад, рытуал, канон;
3) смелы, мужны, баявы, рашучы, адчайны, доблесны;
4) холад, халадэча, зябкасць, стынь, золкасць, сцюдзёнасць;
5) станок, варштат.

11. Адзначце групы слоў з аднолькавым лексічным значэннем:
1) марава – марыва;
2) столь – сталь;
3) дзесь – дзесьці;
4) пешшу – пехатой;
5) сакратарка – сакратарыха.

12. Адзначце пары слоў, якія з'яўляюцца абсалютнымі сінонімамі:
1) рэальнасць – існасць;
2) правапіс – арфаграфія;
3) чым – чымся;
4) часопіс – альманах;
5) ход – перамяшчэнне.

13. Адзначце пары слоў, якія з'яўляюцца паронімамі:
1) дырэктар – дырэктарша;
2) жнівеньскі – жніўны;
3) звыклы – звычайны;
4) крывець – крывіць;
5) каб – кеб.

14. Адзначце пары словазлучэнняў, у склад якіх уваходзяць міжмоўныя амонімы:
1) людской поток – людскі ўчынак;
2) качка корабля – дзікая качка;
3) кожная болезнь – кожнай ноччу;
4) манила дорога – маніла сяброўка;
5) наряд на работу – кароткая нарада.

15. Адзначце сказы, у якіх дапушчана памылка ва ўжыванні слова:
1) Рэдактарскі кабінет знаходзіўся ў другім канцы калідора (М.Ткачоў);
2) Многія з яго вучняў ужо самі стаяць за рэверансам паравоза, умела водзяць цяжкавагавыя саставы (“Звязда”);
3) Усё знаёма, прывычна, і Куляшу здавалася, што нібы і не з ім гэта ўсё робіцца, а з нейкім другім, у другой хаце, а ён глядзіць на ўсё гэта на маўклівым тэлевізійным экране (А.Жук);
4) За сталом сядзеў сярэдніх гадоў мужчына ў ваеннай гімнасцёрцы, побач з ім – мужчына ў цывілізаваным (Я.Курто);
5) Адзін край лесу сутыкаўся з лесам, уразаўся ў яго, адхопліваючы свае травяністыя прасторы (Якуб Колас).

16. Адзначце тыпы антонімаў:

1) няпоўныя;
2) уласнабеларускія;
3) поўныя;
4) сітуацыйныя;
5) аднакаранёвыя.

17. Адзначце сказы з антытэзай:
1) Успамінаю мой цёплы дом, думак халодны пажар. І пад пісьмовым сталом сіксцінскай Марыі твар (У.Караткевіч);
2) І свой заўсёды апраўдаем крок – чужы чужога болю не пачуе (А.Мазько);
3) А мы, прызнацца, хоць мінулі тысячагоддзі, і да гэтага часу не ўмеем хадзіць па зямлі так, як дні і ночы, звяры і птушкі, вятры і дажджы (Максім Танк);
4) Ехаць на вяселле на чужой арбе і смяяцца горка з самаго сябе (Максім Танк);
5) Ні пекла не знаем, ні раю, а верым, што мы – не рабы, хоць веры той век не спрыяе, і гэты наш век, і любы! (Т.Бондар).

## Кантрольная работа № 2 (2 семестр)

*Заданні:*

1. Выканайце тэставыя заданні.

*Варыянт 1*

1. Адзначце прыкметы фразеалагічнай адзінкі:
1) мінімальная адзінка мовы;
2) семантычная цэласнасць;
3) сінтаксічна непадзельнае адзінства;
4) складаецца з марфем;
5) узнаўляльнасць.

2. Адзначце ўласнабеларускія фразеалагізмы:
1) табаку важыць;
2) на горкі яблык;
3) кашу заварыць;
4) бібікі біць;
5) на край свету.

3. Адзначце фразеалагічныя калькі:
1) ставіць на карту;
2) спачываць на лаўрах;
3) з жабіны прыгаршчы;
4) агнём і мячом;
5) залатая сярэдзіна.

4. Дапоўніце адказ:
Семантычна непадзельныя фразеалагічныя адзінкі, значэнне якіх не залежыць ад значэння кампанентаў, што ўваходзяць у іх, – гэта…
1) фразеалагічныя спалучэнні;
2) фразеалагічныя паўкалькі;
3) фразеалагічныя адзінствы;
4) фразеалагічныя калькі;
5) фразеалагічныя зрашчэнні.

5. Адзначце фразеалагічныя адзінствы:
1) шыю намыліць;
2) акінуць вокам;
3) гула асмаленая;
4) ліса фарбаваць;
5) на ногі паставіць.

6. Дапоўніце адказ:

Марфалагічныя варыянты фразеалагізмаў адрозніваюцца адзін ад другога…

1) структурай;
2) склонавымі формамі;
3) месцам націску;
4) колькасцю кампанентаў;
5) формай ліку.

7. Адзначце лексічныя варыянты фразеалагізмаў:
1) свістаць у адну дудку;
2) у адну столку;
3) дуды ў мех складаць;
4) іграць у адну дудку;
5) і дуды вобземлю.

8. Адзначце фразеалагізмы-сінонімы:
1) абводзіць вакол пальца;
2) вочы рэзаць;
3) замыльваць вочы;
4) настаўляць акуляры;
5) пудрыць мазгі.

9. Адзначце фразеалагізмы, якія суадносяцца з назоўнікам:
1) першая ластаўка;
2) курыная галава;
3) аршын з шапкай;
4) гульня з агнём;
5) плячысты на жывот.

10. Адзначце, з якой часцінай мовы суадносіцца фразеалагізм у сказе:

Падарожнікі на хвіліну спыніліся як укопаныя (Я.Маўр)

1) назоўнікам;
2) дзеясловам;
3) прыслоўем;
4) прыметнікам;
5) выклічнікам.

11. Адзначце сказы, у якіх фразеалагізм з’яўляецца выказнікам:
1) Што ты, кажу, лынды б’еш у той час, калі людзі працуюць? (К.Крапіва);
2) Апошняя гэта справа каціць бочкі на жанчыну (У.Караткевіч);
3) Работы на новым месцы будзе па вушы (А.Кулакоўскі);
4) Табе, Андрэй, бачу гэты завод як костка ў горле (Э.Ярашэвіч);
5) Чаго ты мне тутака смаляныя дубы плёў! (А.Шлег).

12. Адзначце кніжныя фразеалагізмы:
1) абіваць парогі;
2) альфа і амега;
3) прыйсці на памяць;
4) яблык разладу;
5) перакаваць мячы на аралы.

13. Адзначце правільнае:

Перыфраза – гэта…

1) трапнае народнае выслоўе з павучальным зместам;
2) устойлівы вобразны зварот, які паходзіць з літаратурных крыніц;
3) устойлівая, узнаўляльная моўная адзінка, якая складаецца не менш як з двух кампанентаў і мае адзінае цэласнае значэнне;
4) семантычна непадзельныя апісальныя назвы прадметаў, дзеянняў, якія ствараюцца непасрэдна ў моўнай плыні, у пэўнай сітуацыі і з'яўляюцца адзінкамі маўлення;
5) спалучэнне слоў, у складзе якога словы не страчваюць лексіка-семантычнай самастойнасці.

*Варыянт 2*

1. Адзначце прыкметы фразеалагічнай адзінкі:
1) устойлівасць;
2) намінатыўнасць;
3) спалучальнасць са словамі;
4) складаецца з асобных слоў-кампанентаў;
5) складаецца са словазлучэнняў.

2. Адзначце запазычаныя фразеалагізмы:
1) агарод гарадзіць;
2) і куры не шэпчуць;
3) дамоклаў меч;
4) на кругі свая;
5) казанская сірата.

3. Адзначце фразеалагічныя паўкалькі:
1) з ветру вяроўкі віць;
2) без году тыдзень;
3) апошні з магікан;
4) на ўсю іванаўскую;
5) адваротны бок медаля.

4. Дапоўніце адказ:

Семантычна непадзельныя фразеалагічныя адзінкі, значэнне якіх можа быць выведзена з пераносных значэнняў іх кампанентаў, – гэта…

1) фразеалагічныя калькі;
2) фразеалагічныя зрашчэнні;
3) фразеалагічныя спалучэнні;
4) фразеалагічныя адзінствы;
5) фразеалагічныя паўкалькі.

5. Адзначце фразеалагічныя спалучэнні:
1) акунёў вудзіць;
2) страх бярэ;
3) кароткая памяць;
4) як свае пяць пальцаў;
5) у свіныя галасы.

6. Дапоўніце адказ:

Фанетычныя варыянты фразеалагізмаў адрозніваюцца адзін ад другога…

1) гукам;
2) месцам націску;
3) асаблівасцямі агаласоўкі кампанентаў;
4) словаўтваральнай структурай;
5) граматычнай формай.

7. Адзначце лексічныя варыянты фразеалагізмаў:
1) носа не ўбіць;
2) крукам носа не дастаць;
3) крукам стаяць;
4) сажнем носа не дастаць;
5) не твайго носа палоса.

8. Адзначце фразеалагізмы-сінонімы:
1) вышэй галавы;
2) мора разліўное;
3) хоць адбаўляй;
4) чорт ногі паломіць;
5) чортава процьма.

9. Адзначце фразеалагізмы, якія суадносяцца з дзеясловам:
1) бачыць наскрозь;
2) лёгкі на нагу;
3) нарадзіцца ў сарочцы;
4) без задніх ног;
5) заткнуць за пояс.

10. Адзначце, з якой часцінай мовы суадносіцца фразеалагізм у сказе:

Слухай мяне і будзеш кум каралю (М.Арочка).

1) дзеясловам;
2) назоўнікам;
3) выклічнікам;
4) прыслоўем;
5) прыметнікам.

11. Адзначце сказы, у якіх фразеалагізм з’яўляецца акалічнасцю:
1) Гулі не аднаго ў лапці абулі (Прыказка);
2) Даўно маю намер пагутарыць з табою вока на вока (Т.Хадкевіч);
3) З вамі я на край зямлі ісці гатова… (А.Бачыла);
4) Люблю адразу браць быка за рогі, каб лішне не марнаваць часу (М.Лынькоў);
5) Для Бойкі навіна была як гром з яснага неба (А.Кудраўцоў).

12. Адзначце прастамоўныя фразеалагізмы:
1) хвастом віляць;
2) падаваць надзеі;
3) кацялок варыць;
4) ахілесава пята;
5) ганяць сабак.

13. Адзначце правільнае:

Афарызм – гэта…

1) семантычна непадзельны апісальны выраз, з дапамогай якога перадаецца сэнс другога слова або выразу;
2) кароткае, дасціпнае, арыгінальнае выслоўе, якое мае закончаны змест і паходзіць з літаратурных крыніц;
3) трапнае народнае выслоўе з павучальным зместам;
4) фігура вобразнасці, пабудаваная на падабенстве двух прадметаў, у якіх праяўляецца агульная прымета;
5) устойлівая, узнаўляльная моўная адзінка, якая складаецца не менш як з двух кампанентаў і мае адзінае цэласнае значэнне.

## Кантрольная работа № 3 (2 семестр)

*Заданні:*

1. Выпішыце словы са звязаным коранем. Падбярыце да іх і запішыце роднасныя словы.

Завулак, абутак, званочак, вытрымаць, паціху, замыка́ць, змакрэлы, кніжнік, лясны, народны, помслівы, пячнік, разгневаны, сівізна, прадвесне, знадворку, каваль, пацалунак, чалавечны.

2. Зрабіце марфемны аналіз самастойных слоў па наступнай схеме:

● *графічна вылучыце ўсе марфемы ў слове;*
● *адзначце, зменнае ці нязменнае слова, укажыце часціну мовы;*
● *адзначце, паказчыкам якіх граматычных форм з’яўляецца канчатак (у тым ліку і нулявы);*
● *вызначыце тып асновы (вытворная / невытворная; простая / складаная; перарывістая / неперарывістая);*
● *вызначыце ролю афіксаў (словаўтваральныя ці формаўтваральныя);*
● *вызначыце тып кораня (свабодны / несвабодны);*
● *запішыце ўсе варыянты кораня.*

Назубок, найбліжэйшы, загор’е, даматканы, безбароды, адрапартаваць, вяселле, дэпутацкі, лясніцтва, мостабудаванне, сустрэча, спачувальны.

3. Вызначыце словаўтваральную базу (аснова, слова, словазлучэнне) прыведзеных слоў, спосаб, тып і падтып утварэння.

Аснежыць, фанетыка-марфалагічны, настольны, лесатундра, школьны, школа-інтэрнат, замаразкі, грукат, знізу, плашч-палатка, прадзед, першакурснік, небасхіл.

4. Зрабіце словаўтваральны аналіз слоў па наступнай схеме:

● *зрабіце графічны словаўтваральны разбор;*
● *устанавіце словаўтваральную базу вытворнага слова: аснова слова, слова цалкам, спалучэнне слоў, словазлучэнне;*
● *назавіце словаўтваральны фармант* (*словаўтваральны сродак*);
● *назавіце спосаб, тып і падтып словаўтварэння.*

Вучань, заўтрашні, мінскі, далеч, мала-памалу, надрадковы, выканкам, спецкурс, разжалобіць, навучыцца, разбегчыся, хто-небудзь, бязмежны.

# ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ, ЯКІЯ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦІПЛІНЫ

Для атрымання аб'ектыўнай інфармацыі аб узроўні паспяховасці студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне "Фанетыка – Лексіка – Словаўтварэнне" (модуль "Сучасная беларуская літаратурная мова 1") мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: апераджальны, бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю ўжываецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

З мэтай выніковай дыягностыкі якасці засваення тэарэтычнага і практычнага матэрыялу студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне "Фанетыка – Лексіка – Словаўтварэнне" (модуль "Сучасная беларуская літаратурная мова 1") вучэбным планам прадугледжана правядзенне кантрольных работ рознага віду. Пры падборы заданняў ўлічваецца аб'ём тэарэтычных звестак па пэўнай тэме, індывідуальны ўзровень падрыхтоўкі навучэнцаў і інш.

Апераджальная, бягучая і прамежкавая дыягностыка кампетэнцый па вучэбнай дысцыпліне "Фанетыка – Лексіка – Словаўтварэнне" (модуль "Сучасная беларуская літаратурная мова 1") можа мець розныя формы, сярод якіх:

- вусны кантроль: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках, калёквіумы, даклады на канферэнцыях, вусныя залікі і экзамены;
- пісьмовы кантроль: тэрміналагічныя дыктанты, дыктанты з дадатковымі заданнямі, дыктанты для самакантролю, кантрольныя апытанні, кантрольныя работы, пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях, рэфераты, пісьмовыя залікі і экзамены;
- графічны кантроль: моўны разбор з дапамогай графічных сродкаў, графічны дыктант (запаўненне табліцы па пэўнай тэме);
- тэставы кантроль: выкананне тэставых заданняў адкрытага і закрытага тыпу.

# ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА РАЗДЗЕЛАХ “ФАНЕТЫКА, ФАНАЛОГІЯ, АРФАЭПІЯ, ГРАФІКА, АРФАГРАФІЯ” (1 СЕМЕСТР)

1. Сучасная беларуская літаратурная мова як аб’ект вывучэння. Мэты і задачы курса “Сучасная беларуская літаратурная мова”, яго сувязь з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі. Раздзелы курса “Сучасная беларуская літаратурная мова”.

2. Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа. Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры. Беларуская мова сярод славянскіх моў, яе адметнасць.

3. Літаратурная мова як форма нацыянальнай мовы, яе прыметы і асаблівасці.

4. Нормы беларускай літаратурнай мовы (арфаэпічныя, арфаграфічныя, лексічныя, граматычныя, пунктуацыйныя, стылістычныя).

5. Беларуская літаратурная мова і дыялекты беларускай мовы, іх узаемадзеянне.

6. Вядомыя беларускія мовазнаўцы, іх навуковая спадчына (І. І. Насовіч, Я. Ф. Карскі, Б. А. Тарашкевіч, М. В. Бірыла, Ф. М. Янкоўскі і інш.).

7. Беларуская літаратурная мова на сучасным этапе.

8. Закон аб мовах у Рэспубліцы Беларусь.

9. Прадмет і задачы фанетыкі. Асноўныя фанетычныя адзінкі(гук, склад, фанетычнае слова, маўленчы такт (сінтагма), фраза). Паняцце гука, аспекты яго характарыстыкі (акустычны(фізічны), артыкуляцыйны, функцыянальны).

10. Галосныя гукі і іх класіфікацыя (паводле ўдзелу губ, паводле ступені і месца пад’ёму языка).

11. Зычныя гукі і іх класіфікацыя (паводле ўдзелу голасу і шуму, спосабу ўтварэння, месца ўтварэння, цвёрдасці і мяккасці).Няпарныя зычныя (паводле глухасці – звонкасці, цвёрдасці – мяккасці). Гукі [в], [ў] і іх месца ў сістэме зычных.

12. Пазіцыйныя змены зычных (асіміляцыя, дысіміляцыя, сцяжэнне гукаў, дзеканне і цеканне [д] – [дз’], [т] – [ц’], аглушэнне зычных у канцы слова, узнікненне прыстаўных гукаў і інш.).

13. Пазіцыйныя змены галосных. Аканне (пасля цвёрдых і мяккіх фанем) у беларускай мове.

14. Чаргаванні гукаў. Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні галосных.

20. Пазіцыйныя чаргаванні зычных (чаргаванні звонкіх і глухіх, цвёрдых і мяккіх, свісцячых і шыпячых).Гістарычныя чаргаванні зычных, іх тлумачэнне.

15. Склад як фанетычная адзінка. Артыкуляцыйная (экспіраторная) і акустычная(санорная) тэорыі склада. Тыпы складоў у беларускай мове. Складападзел.

16. Націск. Тыпы слоўнага націску: дынамічны (сілавы), колькасны (квантатыўны), музычны (танічны), змешаны. Месца націску ў слове (фіксаваны і свабодны, рухомы і нерухомы, асноўны і пабочны). Націск як сродак размежавання слоў і формаў слоў. Пазаслоўныя тыпы націску: тактавы, фразавы, лагічны націск.

17. Інтанацыя. Асаблівасці інтанацыі (мелодыка, інтэнсіўнасць, тэмбр, тэмп маўлення, паўзы). Функцыі інтанацыі (камунікацыйная, вылучальная, арганізуючая, эмацыянальная).

18. Фанетычная транскрыпцыя. Фанетычны аналіз.

19. Фаналогія. Паняцце фанемы. Асноўныя функцыі фанем у мове: перцэптыўная і сігніфікатыўная. Фанематычная транскрыпцыя.

20. Дыферэнцыйныя (фаналагічна істотныя, сэнсаадрознівальныя) і інтэгральныя (тоесныя, агульныя) прыметы фанем.

21. Моцная (незалежная) і слабая (залежная) пазіцыя фанемы. Вырыянт і варыяцыя фанемы. Фанемны рад. Паняцце гіперфанемы і нейтралізацыі фанемы.

22. Сістэма зычных фанем у беларускай мове.

23. Сістэма галосных фанем у беларускай мове.

24. Фанематычная транскрыпцыя.

25. Арфаэпія як раздзел мовазнаўства. Сувязь арфаэпіі з фанетыкай. Даведнікі па беларускай арфаэпіі.

26. Арфаэпічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Прычыны адхіленняў ад нормаў беларускага літаратурнага вымаўлення.

27. Вымаўленне націскных і ненаціскных галосных. Вымаўленне некаторых граматычных формаў.

28. Вымаўленне зычных і спалучэнняў зычных.

29. Графіка як раздзел мовазнаўства. Сувязь графікі з фанетыкай і арфаграфіяй. Літарныя і нялітарныя (націск, апостраф, злучок, пунктуацыйныя знакі і інш.) графічныя сродкі.

30. Беларускі алфавіт. Суадносіны літар і гукаў. Абазначэнне мяккасці зычных. Перадача на пісьме гука [й].

31. Гукавы і складовы прынцыпы беларускай графікі. Адназначныя і двухзначныя літары. Ётавыя літары.

32. Графічны аналіз

33. З гісторыі беларускай графікі. Тры графічныя сістэмы ў гісторыі беларускага пісьменства (кірылаўская, лацінская, арабская). Кірыліца – аснова беларускай графікі. Увядзенне грамадзянскага алфавіта (1708). Прыстасаванне кірыліцы для перадачы фанетычных рыс беларускай мовы (літары **ў**, **і**, **ц**, размежаванне літар **е**, **ё**, дыграфы **дж**, **дз**, апостраф і інш.). Выкарыстанне ў беларускім пісьменстве з канца XVII ст. лацінскай графічнай сістэмы (лацінкі). Паралельнае выкарыстанне ў кнігадрукаванні XIX – пачатку XX ст. кірыліцы і лацінкі. Кітабы.

34. Арфаграфія як раздзел мовазнаўства. Сувязь арфаграфіі з фанетыкай і графікай. Арфаграфічныя слоўнікі і даведнікі.

35. Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі. Арфаграма і апорнае напісанне.

36. Фанетычны і марфалагічны прынцыпы правапісу.

37.Традыцыйныя і дыферэнцыйныя напісанні ў беларускай мове.

38. Напісанні слоў разам, праз злучок і асобна.

39. Правілы ўжывання вялікай літары.

40. Напісанне абрэвіятур. Правілы скарачэння слоў.

41. З гісторыі беларускай арфаграфіі. Станаўленне сучаснай беларускай арфаграфічнай сістэмы. “Беларуская граматыка для школ” Б. Тарашкевіча (1918), яе роля ў замацаванні і ўсталяванні адзіных арфаграфічных і граматычных нормаў беларускай літаратурнай мовы. Змены і спрашчэнні беларускага правапісу ў 1933 г. Удакладненні і частковыя змены беларускага правапісу ў 1957 г. “Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” (1959), іх значэнне ў далейшай нармалізацыі беларускага правапісу і пунктуацыі. “Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” (2008).

42. Арфаграфічны аналіз.

# ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ ПА РАЗДЗЕЛАХ “ЛЕКСІКА. ФРАЗЕАЛОГІЯ. ЛЕКСІКАГРАФІЯ. МАРФЕМІКА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ” (2 СЕМЕСТР)

1. Лексікалогія. Паняцце аб лексіцы і лексікалогіі. Лексікалогія як раздзел мовазнаўства. Сувязь лексікалогіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства.
2. Слова як моўная адзінка. Асноўныя прыметы слова. Слова і паняцце. Лексіка-семантычныя і тэматычныя групы слоў.
3. Лексічнае і граматычнае значэнні слова, іх узаемаабумоўленасць.
4. Тыпы лексічных значэнняў слова.
5. Паняцце адназначнасці і мнагазначнасці. Адназначныя і мнагазначныя словы. Адрозненне мнагазначных слоў ад амонімаў.
6. Асноўныя тыпы пераносных значэнняў: метафара, яе тыпы.
7. Асноўныя тыпы пераносных значэнняў: метанімія, сінекдаха.
8. Аманімія. Адрозненне аманіміі ад мнагазначнасці. Лексічныя амонімы, іх тыпы.
9. Шляхі ўзнікнення амонімаў.
10. Амаформы, амафоны, амографы. Міжмоўныя амонімы.
11. Паранімія. Паронімы, крытэрыі іх вызначэння. Адрозненне паронімаў ад амонімаў і сінонімаў. З’ява паранамазіі. Міжмоўныя паронімы.
12. Стылістычнае выкарыстанне амонімаў і паронімаў. Слоўнікі амонімаў і паронімаў.
13. Сінанімія. Сінонімы. Сувязь сінаніміі з мнагазначнасцю.
14. Тыпы сінонімаў.
15. Сінанімічны рад. Дамінанта ў сінанімічным радзе. Паняцце эўфемізмаў і дысфемізмаў.
16. Стылістычныя функцыі сінонімаў. Слоўнікі сінонімаў.
17. Антанімія. Антонімы, іх разнавіднасці. Антанімія і мнагазначнасць.
18. Стылістычнае выкарыстанне антонімаў (антытэза і аксюмаран). Слоўнікі антонімаў.
19. Лексіка сучаснай беларускай мовы паводле паходжання. Спрадвечна беларуская лексіка. Гістарычныя пласты спрадвечна беларускай лексікі.
20. Запазычанне. Запазычаныя словы ў беларускай мове. Шляхі і прычыны запазычвання. Запазычанні са славянскіх моў (рускай, украінскай, польскай і інш.), іх прыметы.
21. Запазычанні з неславянскіх моў, іх прыметы. Калькі і паўкалькі.
22. Графічнае, фанетычнае, марфалагічнае і семантычнае асваенне запазычаных слоў.
23. Інтэрнацыянальная лексіка. Экзатызмы. Варварызмы.
24. Слоўнікі запазычаных слоў. Этымалагічныя слоўнікі.
25. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання. Паняцце агульнаўжывальнай лексікі і лексікі абмежаванага выкарыстання.
26. Дыялектная лексіка. Дыялектызмы, іх тыпы.
27. Спецыяльная лексіка. Паняцце тэрміна, тэрміналогіі. Спецыфічныя асаблівасці тэрмінаў. Працэсы тэрміналагізацыі і дэтэрміналагізацыі.
28. Прафесіяналізмы. Номены. Іх адрозненне ад тэрмінаў.
29. Жаргон. Жаргонная лексіка. Тэматычныя групы. Спосабы ўтварэння.
30. Арго. Аргатызмы. Слэнг.

31. Стылістычнае выкарыстанне лексікі абмежаванага ўжывання.
32. Актыўная і пасіўная лексіка. Паняцце ўстарэлых слоў. Гістарызмы, іх тэматычныя групы.
33. Архаізмы, іх тыпы.
34. Стылістычнае выкарыстанне ўстарэлых слоў. Гістарычныя слоўнікі.
35. Неалагізмы. Прычыны ўзнікнення неалагізмаў. Спосабы ўтварэння неалагізмаў. Тыпы неалагізмаў.
36. Развіццё лексікі беларускай мовы. Крыніцы і шляхі ўзбагачэння літаратурнай лексікі.
37. Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя функцыянальных стыляў.
38. Навуковы стыль, яго асаблівасці.
39. Публіцыстычны стыль, яго асаблівасці.
40. Афіцыйна-справавы стыль, яго асаблівасці.
41. Мастацкі стыль, яго асаблівасці.
42. Канфесіянальны стыль, яго асаблівасці.
43. Гутарковы (размоўны) стыль, яго асаблівасці.
44. Стылістычная дыферэнцыяцыя лексікі беларускай мовы. Стылістычна нейтральная (міжстылёвая) лексіка, яе адметнасці.
45. Стылістычна афарбаваная лексіка: кніжная і гутарковая (размоўная), яе характарыстыка.
46. Лексіка-стылістычная парадыгма.
47. Нацыянальная адметнасць беларускай лексікі. Адлюстраванне ў лексіцы нацыянальнай культуры і гісторыі. Безэквівалентная беларуская лексіка.
48. Лексічны аналіз. Парадак разбору.
49. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Паняцце аб’ёму фразеалогіі.
50. Фразеалагізм як моўная адзінка, яго асноўныя асаблівасці. Фразеалагізм і слова. Фразеалагізм і словазлучэнне. Сінтаксічная функцыя фразем.
51. Варыянтнасць фразем, іх мнагазначнасць, аманімічнасць, сінанімічнасць і антанімічнасць.
52. Тыпы фразеалагізмаў паводле семантычнай злітнасці кампанентаў.
53. Тыпы фразеалагізмаў паводле адпаведнасці часцінам мовы, паводле адпаведнасці сінтаксічным адзінкам.
54. Тыпы фразеалагізмаў паводле стылістычнай афарбоўкі.
55. Фразеалогія беларускай мовы паводле паходжання. Спрадвечна беларускія і запазычаныя фразеалагізмы. Фразеалагізмы-інтэрнацыялізмы і фразеалагізмы-калькі. Фраземы і пераклад.
56. Крыніцы беларускай фразеалогіі.
57. Этымалогія фразеалагізмаў. З гісторыі ўзнікнення фразеалагічных адзінак (прывесці прыклады).
58. Стылістычнае выкарыстанне фразем. Прыёмы аўтарскага абнаўлення фразеалагізмаў.
59. Парэміялогія. Прыказкі і прымаўкі. Устойлівыя параўнанні.
60. Крылатыя словы, выслоўі і афарызмы. Перыфразы.
61. Лексікаграфія як раздзел мовазнаўства. Энцыклапедычныя і лінгвістычныя слоўнікі (даведнікі).
62. Будова слоўнікавага артыкула. Сістэма граматычных і стылістычных памет, тыпы дэфініцый.
63. Беларускія энцыклапедычныя выданні, іх тыпы і характарыстыка.

64. Лінгвістычныя слоўнікі, іх тыпы, характарыстыка (тлумачальныя, перакладныя, арфаэпічныя, марфемныя, тэрміналагічныя і інш.).
65. Беларускія слоўнікі для школ (тлумачальныя, перакладныя, арфаграфічныя, фразеалагічныя, марфемныя, словаўтваральныя і інш.).
66. З гісторыі беларускай лексікаграфіі. Лексікаграфічная праца Ф. Скарыны, Л. Зізанія, П. Бярынды, І. Насовіча, Я. Ціхінскага і інш.
67. Фразеаграфія як раздзел мовазнаўства. Фразеалагічныя слоўнікі. Будова слоўнікавага артыкула.
68. Парэміяграфічныя слоўнікі (зборнікі).
69. З гісторыі беларускай фразеаграфіі (працы Я. Чачота, М. Федароўскага, І. Насовіча і інш.).

# ПРЫКЛАДЫ КАМПЕТЭНТНАСНА-АРЫЕНТАВАНЫХ ЗАДАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ

## Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 1.

Прачытайце тэкст. Вызначце, да якога функцыянальна-сэнсавага тыпу тэксту ён адносіцца (апісанне, апавяданне, разважанне). Назавіце фанетычныя асаблівасці беларускай мовы. Успомніце, якія асаблівасці беларускай фанетыкі вы яшчэ ведаеце, параўнайце іх з асаблівасцямі рускай фанетыкі.

*Да возера прыкметна падкрадалася восень. На высокіх узгорках рыжэла іржышча. Узвышаліся плячыстыя стагі на паплавах. Сіратлівы бусел, задумаўшыся, стаяў на адной назе і падоўгу глядзеў, павярнуўшы дзюбу, на поўдзень. Нават вада ў возеры пацямнела і ўкрылася дробнай шэранню. Прырода паволі засынала.      П. Броўка.*

## Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 2.

Прачытайце словы і запішыце іх у фанетычнай транскрыпцыі. Ахарактарызуйце асаблівасці вымаўлення галосных і зычных гукаў, спалучэнняў гукаў. Растлумачце пазіцыйныя змены зычных гукаў.

*Пясчынка, падступаць, зацвітаць, дакладчык, на кладцы, заедзьце, выязджаць, расчысціць, святло, Мацвей, пераезд, казка, просьба, подзвіг, збіраешся.*

## Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 3.

Прачытайце словы згодна з нормамі беларускага літаратурнага вымаўлення. Вызначце напісанні, заснаваныя на фанетычным і марфалагічным прынцыпах. Адкажыце, чым адрозніваецца фанетычны прынцып напісання ад марфалагічнага?

*Вокладка, бескарысны, сцежка, роўнядзь, сведка, пяцігодка.*
*Бясконцы, падкрадвацца, падпісаць, прынесены, стужка, барацьбіт.*

## Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 4.

Прачытайце словазлучэнні згодна з нормамі беларускага літаратурнага вымаўлення. Вызначце, у якіх словазлучэннях выдзеленыя словы трэба пісаць з вялікай літары. Запішыце словазлучэнні згодна з правіламі беларускай арфаграфіі. Успомніце, калі і чаму былі ўнесены ўдакладненні ў правілы беларускай арфаграфіі?

*Божы **храм**, **усемагутны** Бог, пазнаёміліся на **сёмуху**, ратуй **божа**, **патрыярх** Маскоўскі і ўсяе Русі, Святы **дух**, Божая **міласць**, здарэнне на **каляды**, не давядзі **бог**, **кароль** Іарданіі.*

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| “Беларускае мовазнаўства”, “Гісторыя беларускай літаратурнай мовы”, “Дыялекталогія беларускай мовы” | Кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбных праграм. | Лічыць праграму узгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі (пратакол № __ ад __.__.2023 г.). |